Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478; Гэнактара—№ 761

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к.; „ 3 „ — 2 р. 70 к.; „ 6 „ — 4 р. — к.; „ 1 год — 8 р. — к. Замена адрэсу: 1 экзэмпляр — 30 к. Месцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АББЕСТКІ: За радок шапіраграфа пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапіраграфа наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапіраграфа перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя на 50 проц. дарожэй. Зьверх зарплаты бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 капп. За кожны дадатковы — 15 „. Бесспрадоўж. і чырвонаармейцам за дакумэнт — 15 „. За кожны дадатковы — 5 „. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. станцыях. АББЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 49 (2538) Субота, 2-га сакавіка 1929 г.

Няўвязка.

Ніводнае сансацыйнае выкрыванье апошніх гадоў ня выклікала столькі адхіленьняў і пратестаў, як агалашэньне сакрэтнага францка-бэльгійскага вайсковага ўгавору. Брыян суха адказаў на запытаньне галяндзкага пасланьніка, што афіцыйнае адхіленьне францускага ўраду ўжо агалошана. У ангельскай палаце нам. міністра замежных спраў Лёкер Лемпсон заявіў, што апрача Лёкарнскага ўгавору між Англіяй і Бэльгіяй ня было падпісана ніводнае згоды. І, нарэшце, міністр замежных спраў Бэльгіі Гіманс рашуча пратэставаў проці абвінавачваньняў у падпісаньні ўгавораў з Францыяй, які парушаць статуту Лігі Нацый і лёкарнскім згодам.

Аднак, рэдакцыя «Утрэхт Дагблят» зноў падцьвярджае, што тэкст угавору быў у яе ў руках, і што сумняваць у сапраўднасьці дакумэнту яна ня можа. Але, што асабліва характэрна, дзяржавы, проці якіх накіроўван угавор, зусім не сумняваюцца ў яго сапраўднасьці. Галяндыя, Нямеччына, Італія і Гішпанія аднесьліся да выкрываньняў галяндзкае газэты зусім сур'ёзна.

І гэта цалкам зразумела, бо зьмест агалошанага ўгавору цалкам адпавядае тэндэнцыям палітыкі Францыі і Англіі. Ці маглі францускія імпэрыялісты шчыра найсьці на падпісаньне гарантыйнага ўгавору з Нямеччынай і на адмову ад свайго «права» навязваць пераможанай у вайне дзяржаве сваю волю? Калі так думалі нямецкія сацыял-дэмакраты і некаторыя колы нямецкае буржуазеі, ускладаўшыя надзеі на «заходнюю арыентацыю», дык гэтым яны выкрылі толькі сваю палітычную недальгабачнасьць, несьвядомасьць і нянавісьць да СССР. Для кожнага, хто хоць колькі-небудзь разьбіраўся ў сэнсе падзей, было зразумела, што Лёкарно было для Францыі актам вымушаным, і што прычынай, якая прымусіла Францыю даць свой подпіс пад Лёкарнскім угаворам, была нуждаванасьць яе дачыненьняў з Англіяй. Было-б, зразумела, вялікаю недальгабачнасьцю думаць, што францускі імпэрыялізм складзе пасьля Лёкарно зброю і не паклапоціцца набыць саюзьнікаў на выпадак, калі-б спрыяючая сітуацыя дазволіла зрабіць яму нажым на Нямеччыну ці Італію. Для мэтаў вайны в абедзьвюмі гэтымі дзяржавамі саюз з Бэльгіяй зьяўляецца для Францыі стратэгічна патрэбным. Гэтае акалічнасьці ня могуць замаскаваць больш ці менш зручныя адхіленьні тых ці іншых міністраў, злоўленых на месцы злачынства.

Калі ў такім становішчы апынуліся буржуазныя лёкарністы, дык становішча сацыял-дэмакратаў сапраўды трагікамічнае. У 1927 г., калі, воцлуг слоў «Утрэхт Дагбляд», былі падпісаны дадатковыя вайсковыя згоды між Францыяй і Бэльгіяй і між Бэльгіяй і Англіяй, і калі зацьвярджаліся пляны і выпрацоўваліся асновы наступнае вайны проці Нямеччыны і Галяндыі, дык бэльгійскім міністрам замежных спраў быў правадыр бэльгійскае сацыялістычнае партыі Вандэрвельдэ. Нездарма «Форвэртс» абыходзіць моўчкі ўсе выкрываньні „Утрэхт Дагблят" і абмяжоўваецца друкаваньнем адхіленьняў Вандэрвельдэ. Бельгійскія сацыялісты выказалі спачуваньне свайму лідэру. Але галяндзкі сацыял-дэмакратычны орган «Хет Фольк» лічыць выкрываньні „Утрэхт Дагбляд" правільнымі. Францускія сацыялісты яшчэ ня ведаюць, якую пазіцыю ім заняць, бо наўрад ці Поль Бонкур ня ведаў аб франка-бэльгійскай інтрызе.

Як загавораць цапер між сабою сацыял-патрыёты сваіх бацькаўшчын? Які напрамак выбяруць яны для захаваньня адзінства свайго, з дазволу сказаць, «інтэрнацыяналу»? Як «растлумачаць» яны акт «няўвязкі» сваёй палітыкі з лёкарнскімі мірнымі абяцаньнямі?

(«Правда»).

ДА МАСКОЎСКАГА ПРАТАКОЛУ ДАЛУЧЫЛАСЯ ТУРЦЫЯ.

МАСКВА. Народны Камісарыят па Замежных Справах абвясьціў ноты, якімі абмяняліся пасол СССР у Турцыі і турэцкі міністр замежных спраў. Нота пасла СССР паведамляла міністра замежных спраў Турцыі аб падпісаньні ў Маскве пратаколу аб безадкладным наданьні правамоцнасьці пакту Келёга і зазначала на пажаданасьць далучэньня да пратаколу Турцыі.

Нота турэцкага міністра замежных спраў паведамляе, што Турцыя, «ахопленая жаданьнем супрацоўнічаць над падтрыманьнем усеагульнага спакою, з прыемнасьцю далучаецца да маскоўскага пратаколу».

КАБУЛ АБКРУЖАН ВОЙСКАМ АМАНУЛЫ.

ТЭРМЭЗ, 26-2. Пацьвярджаюцца паведамленьні аб наступе на Кабул прыхільнікаў Аманулы з поўдня, паўднёвага захаду і захаду. Вярныя Амануле герацкія часьці каля Бамінскага райёну (на паўночны захад ад Кабулу) таксама наступаюць на Кабул. Газьні знаходзіцца ў руках прыхільнікаў Аманулы.

МАГУТНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ ІНДУСАЎ У ЧЭСЬЦЬ АМАНУЛЫ.

ЛЁНДАН, 28-2. Лягорскі карэспандэнт «Экчэнджэ Тэлеграф» паведамляе, што ў Лягоры (Індыя) адбылася нечуваная яшчэ па велічыні дэманстрацыя, калі туды прыехаў поезд з Надыр-ханам. У дэманстрацыі ўдзельнічала тысячы мусульманаў, індусаў і тынхаў. Уздым дасягнуў найвышэйшага распалу, калі Надыр-хан заявіў, што ён не супакоіцца, пакуль Аманул-хан ня будзе ізноў на аўганскім троне.

АНГЕЛЬСКІЯ АГЕНТЫ ПРАЦУЮЦЬ НАД РАЗЬЯДНАНЬНЕМ АЎГАНІСТАНУ.

КАБУЛ, 25-2. Пацьвярджаюцца весткі pra захоп баджаўурскімі ханамі Асмару. Адзначаецца, што сярод ініцыятараў захопу знаходзяцца асобы, якія нічыльна зьвязаны з англа-індускаю ўладаю і нават атрымліваюць ад яе сталую грашовую субсыдыю.

Ёсьць весткі аб падрыхтоўцы таксама захопу Даккі, куды ўжо прыехалі з Індыі некаторыя прыжэныя ханы і правадыры, вядомыя сваёю сувязьзю з ангельцамі.

ЗАЎВАГА: Баджаўур—вобласьць невялікіх фэадальных ханстваў на індускай мяжы, якія знаходзяцца на поўнач ад Хайбэрскага праходу. Асмар—аўганскі горад, які знаходзіцца на захад ад Баджаўуру. Дакка—таксама прыжэныя аўганскі горад на захад ад Хайбэру.

БАЛЬДВІН АДМОВІЎ БЕСПРАЦОЎНЫМ У СПАТКАНЬНІ.

ЛЁНДАН, 28-II. Адказваючы на запытаньне ў палаце вобшчын Чэрчыль заявіў, што прэм'ер Бальдвін лічыць немэтазгодным сустракацца з дэпутацыяй удзельнікаў нацыянальнага паходу беспрацоўных.

„ПРЫЧЫНА БЕСПРАЦОЎЯ—КАПІТАЛІЗМ".

ЛЁНДАН. 28-II. На пасяджэньні палаты вобшчын у часе спрэчак аб беспрацоўі гарнік Айлс, які прыпоў гэтымі днямі ў Лёндан з Паўднёвага Уэльсу, як удзельнік нацыянальнага паходу беспрацоўных, зрабіў выгук кансэрватыўнаму прамоўцу з трыбуны для публікі. Калі кансэрватыўны сябра палаты паведаміў, што «прычынаю беспрацоўя зьяўляецца, папершае, вайна, а падругое—забастоўкі", дык Айлс голасна выгукнуў: «Прычынаю беспрацоўя зьяўляецца капіталізм». Некалькі асоб з публікі схапілі Айлса, але ён моцна адбіваўся, аднак, быў выведзены з трыбуны пры гучных пратэстах шмат каго з рэшты публікі.

Франка-бэльгійская тайная згода—факт.

ГАЛЯНДЫЯ ПАТРАБУЕ ДАДАТКОВЫХ ТЛУМАЧЭНЬНЯЎ.

БЭРЛІН, 28-2. Амстэрдамскі карэспандэнт газэты «Бэрлінэр Тагеблят» заяўляе, што галяндзкі ўрад не прызнае здавальняючымі тых адхіленьняў, якія зроблены да гэтага часу ўрадамі Францыі, Бэльгіі і Англіі і ўжыве далейшыя захады. Галяндзкі ўрад, воцлуг слоў карэспандэнта, паставіць канкрэтнае запытаньне, у якой частцы прызнаюць памянёныя ўрады сапраўднымі агалошаныя ў газэце «Утрэхт Тагблят» згоды, утвораныя ў 1927 годзе.

У зьвязку з заявай ангельскага ўраду ў палаце вобшчын і прадсэдацельнем ангельскага пасла ў Бэрліне нямецкаму ўраду наконт франка-бэльгійскае згоды, у кіруючых нямецкіх палітычных колах заяўляюць, што нямецкі ўрад у далейшым ужыве ўсе захады, каб атрымаць усе магчымыя растлумачэньні аб гэтым пытаньні дыплёматычным шляхам.

Дэтэрдынг разьбіты ў вайне з Нафтасындыкатам Савецкага Саюзу.

ПЕРАД САВЕЦКАЮ НАФТАЮ АДЧЫНЯЮЦЦА НОВЫЯ МАГУТНЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ НА МІЖНАРОДНЫХ РЫНКАХ.

Угавор між Нафтасындыкатам СССР і ангельскім нафтавым камбінатам.

МАСКВА, 28-2. Гэтымі днямі ў Лёндане падпісана гандлёвая згода між кампаніяй Англа-Амэрыкен, якая прадстаўляе буйныя нафтавыя кампаніі ў Англіі, з аднаго боку, і савецкай арганізацыяй па продажы нафты ў Англіі („РОПТ")—з другога. Згода падпісана на 3 гады і зьяўляецца прызнаньнем („РОПТ'а"). як буйнае раўнапраўнае гандлёвае арганізацыі на ангельскім рынку.

Згода прадугледжвае таксама пастаўку вялікае колькасьці савецкае газы, мазуты і казолю для фірм, якія ўваходзяць у «Комбайн», дзе галоўную ролю адыгрывае кампанія пад кіраўніцтвам Дэтэрдынга. Згода, такім парадкам, кладзе канец заўзятай вайне проці савецкае нафты, якую праводзіў на працягу шмат гадоў Дэтэрдынг.

Гэты правал спроб байкоту і блёкады савецкое нафты зьяўляецца буйным эканамічным і палітычным посьпехам Савецкага Саюзу. Дэтэрдынг, які актыўна падтрымліваў белагвардзейскія інтрыгі проці СССР, падпісаў зараз гандлёвую згоду без усялякага задаволеньня савецкім урадам правоў ранейшых уласьнікаў нафтавых вучасткаў, чаго ён раней ультыматыўна дамагаўся.

ЦЬВЁРДАЛОБЫЯ ЎСЁ ЯШЧЭ НІЧАМУ НЕ НАВУЧЫЛІСЯ.

ЛЁНДАН, 28-2. Агенцтва Рэйтэра паведамляе, што намесьнік міністра па справах замежнага гандлю Дуглас Хэкін, выступаючы ў тэкстыльным інстытуце ў Брадфордзе заявіў: «Час ад часу да ўраду зварочваюцца з настойлівою просьбаю распаўсюдзіць экспартныя крэдыты на гандаль з СРСР. Палітыка ўраду, як ніраз ужо заяўлялася, у тым, што пакуль савецкі ўрад ня створыць патрэбных умоў у адносінах выплаты даўгоў і адшкадаваньня за канфіскаваную ўласнасьць і гэтым адновіць давер'е, дык датуль ангельскі ўрад ня бачыць магчымасьці, каб распаўсюдзіць экспартныя крэдыты на гандаль з гэтым краем. Гэта не азначае, аднак, што ангельскі ўрад не жадае гандляваць з СССР. Зусім наадварот, ангельскі ўрад ніколі не перашкаджаў і ня мае намеру перашкаджаць гандлю з Расеяй. Божны камэрсант, які жадае вывозіць свае тавары ў Савецкі Саюз, можа рабіць гэта. Абхват ангельскага гандлю з Расеяй у сучасны момант значна большы, чымся згаджаюцца нам паверыць некаторыя ня зусім прыязныя людзі.»

Ход перамоў.

ЛЁНДАН. 28-2. Вячэрняя газэта «Стар» паведамляе, што папярэднія перамовы між ангельскім камбінатам нафтавых кампаній (Дэйтэрдынгаўскім) і нафтасындыкатам СССР амаль-што скончаны. Агульная згода ў прынцыпе дасягнута, і асобныя нафтавыя кампаніі абмяркоўваюць будучую палітыку. Чакаюць, што як спыніцца савецкая канкурэнцыя, дык цэны на бэнзыну павялічацца.

Водуг вестак газэты, супрацоўніцтва камбінату з Нафтасындыкатам можа вылявіцца або ў прапарцыянальным разьмеркаваньні долаў увозу ў Англію, або ў згодзе наконт цэн.

„БЛІЗЯЦЦА РАДЫКАЛЬНЫЯ ЗЬМЕНЫ"

«ГАЗЭТА ВАРШАЎСКА» АБ РОСЬЦЕ ЦІКАВАСЬЦІ НА ЗАХАДЗЕ ДА СССР.

ВАРШАВА, 28-II. Орган эндэкаў «Газэта Варшавска» агаласіў артыкул, у якім адзначаецца агульная цікавасьць чужаземных капіталістаў да СССР. Аўтар артыкулу тлумачыць гэта пашырэньнем у капіталістычных краёх эканамічнага крызісу, які прымушае капітал шукаць новых рынкаў збыту.

«Адначасна,—зазначана ў артыкуле,—троба чакаць радыкальных зьмен у палітыцы капіталістычных дзяржаў у адносінах да СССР. Аб заснаваньні антысавецкага фронту зараз ня можа быць і гутаркі».

Вялічэзны эканамічна-палітычны посьпех СССР.

Тав. Сакольнікаў аб лёнданскай згодзе.

У зьвязку з падпісаньнем у Лёндане гандлёвае згоды між кампаніяй «Англа-Эмэрыкен», прадстаўніцаю самых буйных нафтавых кампаній, якія працуюць у Англіі, і савецкай арганізацыяй па продажу нафты ў Англію («Эркопе РОПП»), «Известия ЦИК» зьмяшчаюць такую гутарку з прадстаўніком праўленьня Нафтасындыкату Сакольнікавым:

«Праўленьне Нафтасындыкату атрымала сёньня паведамленьне з Лёндану, што дасягнута згода між савецкім таварыствам па продажу нафтапрадуктаў у Англіі і Англа-Амэрыканскай кампаніяй. Гэтая згода зьяўляецца вынікам зацяжных перамоў, якія распачаты былі яшчэ ўвосень. Перамовы ўпачатку, аднак, ня мелі посьпеху і былі перарваны з прычыны таго, што самая буйная з нафтавых арганізацый, якая дзейнічае ў Англіі, а іменна, англа-галяндзкая кампанія на чале з Дэтэрдынгам, паставіла ўмовай падпісаньня гандлёвае згоды з Нафтасындыкатам і яго філіялам у Англіі «РОПП'ам» — прызнаньне і прынцыпу 5-ціпроцантнае скідкі з цаны, намечаных да рэалізацыі ў Англіі савецкіх нафтапрадуктаў для перадачы іх у фонд выплаты ранейшым уласьнікам, маемасьць якіх была нацыяналізавана ў СССР. Натуральна, што перамовы на такой аснове не далі здавальняючых вынікаў, і вострая канкурэнцыя на ангельскім рынку ня спынялася. Гэтая канкурэнцыя выклікала зьніжэньне цэн на ангельскім рынку значна больш, як на сусьветным рынку; ад гэтага ангельскія і амэрыканскія кампаніі, якія гандлююць нафтапрадуктамі на ангельскім рынку, падарцелі вялікія страты. Трэба зазначыць, што амэрыканскія нафтавыя трэсты, якія купляюць савецкія нафтавыя прадукты для перапродажу на ўсходніх і іншых рынках, не падтрымлівалі патрабаваньня аб 5-ціпроцантнай скідцы, якое мела выразна палітычны характэр. Больш таго, амэрыканскія фірмы, зацікаўленыя ў стане рэчаў на ангельскім рынку, выказалі згоду спрыяць прызначэньню правоў савецкае нафты на бесперашкодную рэалізацыю і не падтрымлівалі плянаў байкоту савецкіх нафтапрадуктаў, які пранагандаваўся пад лёзунгам: савецкая нафта—„крадзеная нафта". Гэты апошні лёзунг зьяўляецца спробаю адхіляць заканамернасьць савецкага гандлю і абвясьціць блёкаду савецкаму нафтаэкспарту. Нафтавы канфлікт, як вядома, стаў цэнтрам палітычнае кампаніі проці Савецкага Саюзу ў шмат-якіх дзяржавах. Няўдача гэтае кампаніі і поўны правал спроб затрымаць разьвіцьцё савецкага нафтаэкспарту, аднак, у апошні час выявіліся цалкам. Ня дзіва, што ў пачатку студзеня перарваныя ўвосень перамовы адновіліся на гэты раз на аснове адмовы ад патрабаваньня 5-ціпроцантнага адліку на карысьць ранейшых уласьнікаў. На гэтай аснове і дасягнута зараз камэрцыйная згода, якая дае магчымасьць парнальна рэалізаваць сакцыя нафтапрадукты ў Англіі.

Згода падпісана на 3 гады. Яна ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ НАМ ВЫВАЗ І РАЗЬМЯШЧЭНЬНЕ НА АНГЕЛЬСКІМ РЫНКУ БЛІЗКА 1-ГО МІЛІЁНУ ТОН НАФТАПРАДУКТАЎ ШТОГОДУ.

Згода будзе ў значнай меры спрыяць стварэньню нармальных камэрцыйных варункаў на ангельскім рынку, і азначае, што фактычна ўсе прадстаўленыя памянёнай англа-амэрыканскай кампаніяй фірмы па гандлі нафтапрадуктамі на ангельскім рынку, у тым ліку і кампанія Дэтэрдынга, згадзіліся на заснаваньне рэгулярных гандлёвых зносін з савецкімі гаспадарчымі органамі. Згода, бясспрэчна, зьяўляецца станоўчым фактам з пункту гледжаньня гаспадарчых інтарэсаў Савецкага Саюзу. Падпісаньне 3-хгадовага ўгавору азначае калі ня поўнае спыненьне актыўных варожых выпадаў проці СССР з боку некаторых нафтавых арганізацый, дык ва ўсякім разе, сур'ёзны пералом у іх адносінах да СССР.

Вельмі магчыма, што падпісаньне «мірнага ўгавору» ў Англіі аб рэалізацыі савецкае нафты мае таксама сувязь з настроямі некаторае часткі ангельскіх фінансавых і прамысловых колаў, якія ўсё больш пераконваюцца ў карыснасьці і мэтазгоднасьці палепшыць адносіны, якія зараз існуюць між Англіяй і СССР».

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

ВЕСНАВЫ ЗАСЕЎ НАСЕНЬНЕМ ЗАБЯСЬПЕЧАЕ.

БЕЛАРУСЬ АТРЫМАЕ БОЛЬШ 3.300 ТОН НАСЕННАГА ЗБОЖЖА.

МАСКВА, 28-2. Калегія НК Гандлю СССР зацьвердзіла плян выдачы насеннага збожжа да веснавое засеўнае кампаніі 1929 году ў разьмеры 303.000 тон, у тым ліку па РСФСР—118,2 тысячы тон, УССР—170,1 тысяч, БССР—3,3 тысячы тон і ў запасе застаецца паўтары тысячы тон. Гранічным часам адгрузкі насеннага збожжа для Ніжня-Волскага райёну ўстаноўлена 10-га сакавіка; для Сярэдня-Волскага райёну, Цэнтральна-Прамысловай вобласьці, Паўночнага Каўказу, Цэнтральнае Чорназёмнае вобласьці, Тульскае і Разанскае губэрняў—20-га сакавіка; для Татарэспублікі, Кастрамское і Цьвярское губэрняў—25-га сакавіка; па УССР—тэрмін для ўнутры-украінскіх перавозак устанаўляецца са згоды з Укрнаркамгандлем і Укрнаркамземам, а адгрузка з РСФСР скончыцца ў лютым. Па БССР час адгрузкі насеннага аўса ўстанаўляецца са згоды з НК Гандлю Беларусі і Украіны. Загатоўчыя арганізацыі, якія адгружаюць насеннае збожжа ніжэй устаноўленых кандыцый, прыцягваюцца да крымінальнае адказнасьці.

Жанчына ў трактарных калёнах.

МАСКВА, 28-2. Адзел работніц і сялянак ЦК УсеКП(б) прапануе мясцом наладзіць у райёнах, дзе ёсьць трактарныя калёны, шырокую кампанію растлумачэньня за ўдзел сялянак у працы трактарных калён. Адначасна мясцом прапанавана забясьпечыць пасылку батрачак і бядначак на курсы трактарыстаў. Уся праца павінна праводзіцца адцэламі работніц і сялянак разам з сельска-гаспадарчай кааперацыяй.

Уся вёска стала калектывам.

УЛЬЯНАЎСК. Вёска Хімненкі, Карсунскага райёну, якая складаецца з 216-ці двароў, цалкам перайшла на статут таварыства з грамадзкаю апрацоўкаю зямлі. Калгассаюз выдае Хімненкам 2 трактары.

Нью-Ёркскія трацкісты супрацоўнічаюць з паліцыяй

НЬЮ-ЁРК, 27-2. У Нью-Ёрку адбыўся мітынг трацкістаў. Водуг згоды з арганізатарамі мітынгу, паліцыя гналтам выганяла камуністаў, якія зьяўляліся на мітынг.

ДАКЛАД САМАЙЛОВІЧА У ПАРЫЖЫ.

ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ПАРЫЖУ ГОРАЧА ВІТАЕ ГЭРОЯЎ-КРАСІНЦАЎ.

ПАРЫЖ, 28-II. У аўдыторыі акіана-графічнага інстытуту ў Сарбоне (Парыскі унівэрсытэт) адбыўся даклад Самайловіча аб праны экспедыцыі «Красіна». Аўдыторыя не магла зьмясьціць усіх, хто жадаў прысутнічаць на дакладзе. Яшчэ загадзя да дакладу на вуліцы вышлося 2 з паловаю тысячы чалавек, якія ўжо не маглі быць упушчаны ў перапоўненую залю.

Уступнае слова сказаў прафэсар Дуазэ. Пасьля яго выступіў сустрэчаны гучнай авацыяй Самайловіч, які зрабіў свой даклад на французкай мове. Аўдыторыя на раз-пераплыла даклад гучнымі воплескамі. Выступіўшы пасьля Самайловіча вядомы дасьледца канцавосных мораў Шарпо выказаў у кароткай прамове захапленьне французкае грамадзкасьці ад працы савецкае экспедыцыі. Сход праводзіў Самайловіча і Чухноўскага гучнай авацыяй.

МАГЧЫМЫ ВЫХАД КІТАЮ З ЛІГІ НАЦЫЙ.

ШАНХАЙ, 28-2. Сун-Фо прапануе палітычнай радзе ўхваліць пастанову аб выхадзе Кітаю з Лігі Нацый. Прапалова перадаецца на разгляд зьезду Гаміндану.

Шэрагі Прафінтэрну буйнеюць.

НЬЮ-ЁРК, 28-2. Выканаўчы камітэт нацыянальнага саюзу гарнякоў ўхваліў далучыцца да Прафінтэрну.

ПРАЦЭС ГРАМАДЫ.

СЕТКА ПАЛІТЫЧНЫХ ІНТРЫГ ВАКОЛ ПРАЦЭСУ.

Першы дзень працэсу Грамады быў заняты зачытаньнем актаў справы.

Працэс, які слухаецца без абвінавачаных і амаль-што ў пустой залі, толькі вонкава робіць уражаньне спакойнага разгляду. На справе-ж навакол працэсу разыгрываецца самая складаная інтрыга ўплывовых колаў, пісудчыкаў і іх прыхвасьняў—беларускіх згоднікаў. З гэтае прычыны палітычныя колы прыківаюць разгляду справы ў апэляцыйнай інстанцыі большае палітычнае значэньне, чымся разгляду яе ў акруговым судзе. На цяжка дагадацца, што праз адпаведнае манэўраваньне на працэсе пісудчыкі спадзяюцца набыць апору ў беларускім згодніцтве, афарбаваным у нацыянальны, а таксама антыкамуністычны колер. Калі гэты плян удасца, дык кіраўніцтва згодніцкім рухам сярод беларусоў пройдзе ў рукі тых пісудчыкаў, якія наспэцыялізаваліся ў нацыянальным пытаньні.

На пераглядзе справы кіраўнікоў разгромленае ў 1926 годзе Рабоча-Сялянскае Грамады (засуджаных, за малым выключэньнем, на надзвычайна вялікі час каторгі—да 12-ці гадоў) шырока адгукнулася беларуская грамадзкасьць. У розных мясцох мелі месца арышты. Паліцыя канфіскавала грошы, сабраныя на наладжаньне абароны. Распаўсюджана вялічэзная колькасьць адозваў.

Арышты ў Вільні ў зьвязку з працэсам.

ВАРШАВА, 28-2. У часе непарадкаў у віленскай беларускай гімназіі арыштаваны 22 чалавекі.

Колькі пратрывае працэс „Грамады".

«Слово» (№ 49) паведамляе, што працэс „Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады" пратрывае 7-8 дзён.

Суд над адным з „грамадаўцаў".

25 лютага ў віленскім акруговым судзе разьбіралася справа Лявона Мэнка, абвінавачанага ў прыналежнасьці да «Бел. С.-Р. Грамады". Акт абвінавачаньня, як і на ўсіх іншых працэсах „Грамады", зачыдаў абвінавачанаму, што ён ад 1926 г. быў адным з антыўнейшых члекаў «Грамады», што ён працаваў разам з камуністычнымі дзеячамі П. Цьвяткоўым, Макоўскім і Бабровічам, што ён арганізаваў у Вільні мясцовы гурток і быў сябрам яго камітэту, пісаў артыкулы ў органы «Грамады», правадырстваваў маніфэстацыямі 8, 11, і 14 сьнежня 1927 г. і г. д.

Абвінавачаны А. Мэнко пракурор Клясоні выдомы на працэсу віленскае групы «Грамады»; бараніў праф. Пятрусевіч. Паліцэйскі камісар Назаркуські і шэф Бабкіні не маглі прадставіць суду нічых рэчавых доказаў сваіх закідаў.

Суд апраўдаў А. Мэнко.

АД РЭДАКЦЫІ: А. Мэнко скончыў Віл. Бел. Гімназію і потым быў студэнтам Праскага ўнівэрсытэту. Па нацыянальнасьці—ён немец.

СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАГА ТЭРОРУ.

Патрабуем вызваленьня ўсіх засуджаных грамадаўцаў.

(На сходзе кавуковых працаўнікоў).

28-га лютага ў доме асьветы адбыўся аб'яднаны сход супрацоўнікаў калектываў —Беларускай Акадэміі Навук, Навукова-Дасьледчага Інстытуту Сельскай і Лясной Гаспадаркі імя Леніна і 8-га групкому, на якім была заслухана інфармацыя т. НЕКРАШЕВІЧА аб апошніх падзеях у Заходняй Беларусі. У сваім дакладзе т. Некрашэвіч спыніўся на разгроме Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады польскім фашысцкім урадам і аб фашысцкіх махінацыях закон апэляцыйнага працэсу.

Па дакладу т. Некрашэвіча выступіў намесьнік старшыні Галоўнай Управы Т-ва Беларускай Школы Заходняй Беларусі і настаўнік Віленскай Беларускай Гімназіі т. Савіцкі, які прадэманстраваў фактамі вьдзекі і ўцісн фашысцкага ўраду Польшчы над беларускім нацыянальна-сацыяльным рухам.

Сход прыняў наступную РЭЗАЛЮЦЫЮ:

Аб'яднаны сход культурна-асьветных працаўнікоў Народнага Камісарыяту Асьветы, Беларускай Акадэміі Навук, Навукова-Дасьледчага Інстытуту Сельскай і Лясной Гаспадаркі імя Леніна, Беларускага Дзяржаўнага Музэю і Цэнтральнага Архіву г. Менску, заслухаўшы інфармацыю аб апошніх падзеях у Заходняй Беларусі, з глыбокім абурэньнем канстатуе новую праву белага тэрору польскага фашызму.

Зруйнаваўшы беларускія культурна-асьветныя ўстановы, пазбавіўшы правоў беларускія працоўныя масы, дзеўшы ўдар дапоўнага эканамічнага заняпаду, польскі фашызм разграміў масавую беларускую легальную арганізацыю «Беларускую Сялянска-Работніцкую Грамаду». Усе актыўныя ўдзельнікі Грамады былі пасаджаны за краты і атрымалі цяжкія шматгадовыя катаржныя прысуды.

Гэтыя агідныя учынкі польскага фашызму выклікалі бурную хвалю пратэстаў працоўных мас усяго сьвету.

Мы, культурна-асьветныя працаўнікі г. Менску, сабраўшыся ў колькасьці 216 чалавек, рашуча пратэстуем перад усім сьветам супроць жорстка мануўраў польскага фашызму, накіраваных на ўдушэньне беларускага нацыянальна-вызвалечага руху, на поўнае знабаленьне беларускіх працоўных мас.

Мы заклікаем працоўныя масы Заходняй Беларусі цьвёрда стаць на варце сваіх інтарэсаў і не паддавацца на правакацыі польскага фашызму. Мы патрабуем спыненьня белага тэрору ў Польшчы, мы патрабуем вызваленьня ўсіх палітвязьняў.

Нехай жыве камуністычная партыя Заходняй Беларусі!

Ганьба здраднікам беларускага руху Астроўскаму і Лупкевічу і падобным да іх.

Ганьба здраднікам і згоднікам!

(Рэзалюцыя надзвычайнага агульнага сходу супрацоўнікаў НКФБССР).

Заслухаўшы даклад сэкратара бюро ячэйкі МОПР'у пры НКФ т. Заяца па пытаньні аб пераглядзе ў апэляцыйным парадку ў Вільні справы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, надзвычайны агульны сход супрацоўнікаў НКФ БССР адзначае:

На працягу 2-х год пасьля разгрому 100-тысячнай Бел. Сялянска-Работніцкай Грамады масавы белы тэрор на абшарах Заходняе Беларусі супроць сацыяльнага і нацыянальнага вызваленчага руху працоўных ня спыніўся, а ніччо больш узмацніўся.

Масавы нацыянальна-вызваленчы і сацыяльны рух беларускіх працоўных Заходняй Беларусі, ня гледзячы на адыход ад яго верхавіны беларускай інтэлігенцыі, ня толькі не пераможаны, але далей расьце і робіцца яшчэ больш незломным у барацьбе з польскімі абшарнікамі і капіталістамі. Якія-б правакацыйныя спробы перацягнуць на свой бок хісткія элементы польскі фашызм ні рабіў, працоўныя масы Заходняй Беларусі, пад кіраўніцтвам КПЗБ, сваёй барацьбы з класавымі ворагамі не спынюць.

У імя класавай салідарнасьці, супрацоўнікі НКФ БССР разам з усімі працоўнымі БССР і СССР узьнімаюць свой голас рашучага пратэсту супроць нечуванага зьдзеку і гвалту над працоўнымі Заходняе Беларусі, супроць завастрэньня белага тэрору і патрабуюць вызваленьня з польскіх астрогаў усіх грамадаўцаў, усіх палітвязьняў.

Ганьба здраднікам і згоднікам!

Нехай жыве КПЗБ—незломны правадыр працоўных Заходняй Беларусі!

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Пілсудзкі запужвае сойм.

ВАРШАВА, 28-2. У зьвязку з надыходам спрэчак у сойме наконт зьмены канстытуцыі палітычныя колы лічаць магчымым абвастраньне канфлікту між соймам і ўрадам. Газэты паведамляюць, што Пілсудзкі намерен зьвяціца ў сэнат у часе абмеркаваньня вайсковага бюджэту і зрабіць паведамленьне аб справах падведамсьцьвеннага яму міністэрства. Пілсудзкі ня толькі ня зьявіўся ў сойм, калі там абмяркоўваўся вайсковы бюджэт, але нават ня прыслаў свайго прадстаўніка для ўдзелу ў гэтых спрэчках. У гэтых умовах намер Пілсудзкага выступіць у сэнаце разглядаецца, як пагроза сойму.

ЗАКОНАПРАЭКТ АБ РАТЫФІКАЦЫІ МАСКОЎСКАГА ПРАТАКОЛУ.

ВАРШАВА, 28-2. Міністэрства замежных спраў падало ў сойм законапраэкт аб ратыфікацыі маскоўскага пратаколу. Законапраэкт будзе абмяркоўвацца на адным з чарговых пасяджэньняў сойму.

Арышты украінскіх камуністаў.

«Кур. Варш.» (№ 56) паведамляе, што ў Ковелі арыштован павятовы камітэт «Кампартыі Зах. Украіны», у Турыску (Ков. пав.) арыштован якісь-ці «Рэвком», а на абшары Уладзімірскага пав.—некалькі камуністычных ячэек. Агулам арыштавана каля 60 камуністаў, пераважна ўкраінцаў.

Справа „караля бандытаў" А. Байкі.

Гэтымі днямі ў варшаўскім акруговым судзе разглядалася справа А. Байкі „караля бандытаў" з Беларускай пушчы, як называе яго „Кур. Варш". А. Байка ўжо некалькі разоў прыгаворваўся судом да кары сьмерці. Між іншым, яго абвінавачаюць у забойстве брата «генэрала Балаховіча. Суд замяніў А. Байку кару сьмерці на бастэрніовую катаргу.

Староста—забойца.

Рацамскі акруговы суд прыгаварыў радамскага старасту С. Гулінскага за неасьцярожную яду на самаходзе, дзякуючы якой ён забіў 17 кастрычніка мінулага году работніка Пецрыкаўскага, толькі на 1 месяц астрогу.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Кячуваныя зьдзекі охранкі над палітзьняволенымі.

ЯК ДЭФЭНЗЫВА ДАБІВАЕЦЦА ПАКАЗАНЬНЯЎ АД БЕЛАРУСКІХ СЯЛЯН

ВІЛЬНЯ, 27. Готымі дымі ў м. Слоніме выязной сесіяй Гарадзенскага акругового суду слухалася справа 17-цігадовага рабочага Арушэвіча і беларускага селяніна, якія абвінавачаліся ў прыналежнасьці да кампартыі Зах. Беларусі.

У мінулым годзе польская паліцыя затрымала аднаго беларускага селяніна з в. Чэмары, Слонімскага павету. Пры гэтым у затрымана а нібы-та знайшлі камуністычную літаратуру. На допыце селянін заявіў, што яму гэтую літаратуру даў адзін зусім незнаёмы яму хлопец. Тады маладым арыштавала 5 маладых рабочых, якія былі пад надзорэньнем.

Калі селяніна прывялі на вочную стаўчу з адным з арыштаваных рабочых і запыталі ці гэта ён, дык селянін адказаў адмоўна. Тады паліцэйскія пачалі жорстка зьбіваць селяніна. Калі прывялі другога, селянін, не гледзячы на зьбіваньні, таксама даў адмоўны адказ. Тады яго зноў неміласэрдна зьбілі. Так катаваньні на спыналіся, пакуль не дайшлі да жанчыны з пяці арыштаваных рабочых.

Бачачы, што на нагo-небудзь трэба ж пазнавець, бо інакш паліцыя яго заб'е зусім, паўмывы селянін паказаў на апошняга—Арушэвіча.

На судзе селянін заявіў, што паказаў на Арушэвіча толькі таму, каб збавіцца ад зьдзекаў і катаваньняў з боку охранкі.

Ня гледзячы на гэта суд прыгаварыў падсудных на 4 гады катаргі кожнага.

У вілекскай беларускай гімназіі.

Газэта „Слово" № 43 друкуе наступную заметку аб беларускай гімназіі: «бацькоўскі камітэт і пэдагагічная рада беларускай гімназіі ў Вільні, жадаючы ўшанаваць 10 годзьдзе існаваньня гэтай гімназіі, пастанавіла выдаць адваднёўку, якая абымала-б нарыс гістарычнага існаваньня гэтай гімназіі, а таксама інфармацыі аб яе сучасным стаўленьні».

Аднак, па меры наплыву ўсё-больш значных матар'ялаў, рэдакцыйная калегія прышла да пераконаньня, што жыцьцё беларускай школы ў Польшчы патрабуе сталага асьвятленьня і нарушэньня ў друку ўсялякіх яго пытаньняў і балячак.

Рэалізацыя гэтай думкі выявілася ў выданьні пэрыядычнай часопісі «Сяй'я і школа» № 1 гэтага выданьня, 20 старонак друку, in-кварто, і аздоблены некалькімі ілюстрацыямі, якія прадстаўляюць найвыдатнейшых беларускіх школьных дзеячоў, а таксама будынак беларускай гімназіі ў Вільні. Як рэдактар, падпісаў часопісь В. Грышкевіч; выдавец гэтай часопісі—бацькоўскі камітэт беларускай гімназіі ў Вільні.

З пасобных артыкулаў, зьмешчаных у пэрыёдным нумары, заслугоўваюць увагі наступныя: артыкул прысьвечаны 10-годзьдзю беларускай гімназіі ў Вільні, камунікат пэдагагічнай рады аб апошніх падзеях у гэтай-жа гімназіі, урэшце арт. пана Р. Астроўскага пад загалоўкам «Публічная асьвета ў Польшчы.

Новы працэс у Навагрудку.

26 лютага як паведамляе «Слово» (№ 43) у Навагрудку пачаўся працэс пры 14 асоб, абвінавачаных у шпіянажы; сярод іх дзьве асобы з вышэйшай адукацыяй.

Суд над беларускімі сялянамі.

Акруговы суд у Беластоку прысудзіў 5-га лютага восем сялян вёскі Саколкі да 6 год катаргі кожнага—3-х—да 4 год і восем—да 2-х год за «дзяржаўную здраду і падрыхтоўку да «вызрынуцьця існуючага ладу».

Арышты ў Міцкунскай воласьці.

Пасьля рэвізіі дзеławодства Міцкунскай воласьці, Віленскага пав., арыштаваны былыя войты (сельскія старосты): Дземешка, Кардзіс і сучасны войт Тамашэўскі за шэраг зробленых злоўживаньняў.

Зьезд ваяводаў „Усх. Крэсаў" у Вільні.

«Дзённік Віл.» (№ 46) паведамляе, што 24 лютага ў Вільні пачаўся зьезд «крэсавых» ваяводаў, у якім прымаюць удзел віленскі ваявода У. Рачкевіч, беластоцкі—Н. Кірст, навагрудзкі—З. Бочкевіч, валынскі—Г. Юзэфскі і палескі—Я. Кранальскі.

Якія справы павінны разглядзецца на зьезьдзе, газэта не паведамляе.

Справы нацыянальнай палітыкі на зьезьдзе ваяводаў.

«Слово» (№ 47) паведамляе, што на зьезьдзе «крэсавых» ваяводаў у Вільні, апрача іх, былі прысутнымі і наступныя асобы: дырэктар палітычнага дэпартаманту мін. унутр. спраў Пацяркоўскі і дырэктар дэпартаманту нацыенскіх спраў Сухоцкі.

Іх прысутнасьць, як нам здаецца, ня вымагаецца толькі адными гаспадарчымі справамі, як аб гэтым раней пісалі польскія газэты.

Зьезд старостаў Віленшчыны.

23 лютага ў віленскай ваяводзкай управе адбылася канфэрэнцыя старостаў Віленшчыны, на якой абгаварвалася справа разьдзелу між паасобнымі паветамі крэдытаў, прызначаных на дапамогу люднасьці, пацярпеўшай ад неўраджаю. «Роўным чы[illegible] [illegible]раўся шэраг іншых бягучых [illegible] сабе «Дз. Віл.» (№ 46).

[illegible] сенату ў яўрэйскай гімназіі.

Маршалак польскага сэнату п. Шыманскі разам з яўрэйскім сэнатарам д-рам Шабадам наведаў віленскую яўрэйскую гімназію, якая не карыстаецца ніякім правам, быў на некаторых лекцыях і потым абяцаў пахлапаціцца аб паданьні гімназіі праў публічнасьці.

Нявыкананы замах?

„Слово" (№ 45) паведамляе, што некальні дзён таму назад паліцэйскі патруль затрымаў у Слоніме нейкага Леона Камінскага, які пры набліжэньні да яго паліцэйскіх кінуўся на іх з бомбаю, якую ў яго адабралі. У паліцэйскім вучастку быццам выясьнілася, што Камінскі меў намер зрабіць замах з ручнымі гранатамі на аднаго з служачых сьледчага аддзелу, адкуль гэтага ня выманаў, бо заўсёды ў сьледчым аддзеле знаходзіліся пастаронньія людзі.

Вынікі выбараў да навагрудзкага магістрату.

24 лютага адбыліся выбары да навагрудзкага магістрату, рэзультаты якіх наступныя: польска-беларуская група (аляксюкоўцы) атрымала 7 мандатаў, хрысьціянска - магамэтанская—12, яўрэйская—12, мяшчанская—4 і магамэтанская—1.

Вынікі выбараў да баранавіцкага магістрату.

На выбарах у баранавіцкі магістрат польская група атрымала 7 мандатаў, яўрэйская—11, ПКС—2, расейцы—2, Бунд—1 і Поалей-Сыён—1.

Крызіс у віл. яўрэйскай радзе.

У сувязі з цяжкай фінансавай сітуацыяй віленскай яўрэйскай рады—прэзыдыум рады з старшынёю Крукам падаўся ў адстаўку.

Белыя рабыні.

«Слово» (№ 46) паведамляе, што 2 сакавіка выяжджае з Вільні ў Францыю транспарт сельска гаспадарчых работніц заангажаваных у паветах Сьвянцянскім і Маладэчынскім.

Канфіскацыя „Вільнэр Тог".

Віленская адміністрацыя сканфіскавала яўрэйскую газэту «Вільнэр Тог» ад 26 лютага за зьмяшчэньне артыкулаў і заметак, забароненых арт. 129 КК.

У „беларускай духоўнай сэмінарыі".

„Кур'ер Віл." (№ 47) паведамляе, што ў «бел. дух. сэмінарыі» ў Вільні на пасаду інспэктара яе назначэна б. кіраўнік беларускай гімназіі ў Вільні Ал. Міхалевіч.

«Гэтае назначэньне, піша «Кур. Віл.»,—трэба прызнаць высока адпаведным, бо п. Міхалевіч бязумоўна здолее зьмяніць дужую атмасфэру праваслаўнай сэмінарыі»...

Што пад усім гэтым разумее „Кур'ер Віленскі",—трудна сказаць.

Бюджэт Вільні.

„Дз. Віл." (№ 48) паведамляе, што ўжо апрацован бюджэт г. Вільні, які раўняецца 12 млн. зл. У параўнаньні з бюджэтам мінулага году ён большы на 10 процантаў.

У ЛІТВЕ.

Новыя арышты

Ковенскай жандармерыяй (охранка) за апошнія дні існую праведзены 15 арыштаў сярод рабочых; якія падазраюцца ў прыналежнасьці да кампартыі. У часе вобыску нібы выкрыты камуністычныя абежныя лісты і нелегальная літаратура.

Бунт беспрацоўных.

«Дз. Віл.» (№ 48) паведамляе, што ў Вільканіры, з прычыны беспрацоўя, дайшло да бунту. У справу ўмешалася войска, якое разагнала натоўп. Беспрацоўныя страляні ў войска. Шмат асоб паранена, шмат арыштавана.

Працэс „плечкайцісаўцаў" у Коўні.

„Летувос Жыніос" паведамляе, што 25 лютага пачаўся ў ковенскім акруговым судзе працэс 21 абвінавачанага ў прыналежнасьці іх да групы Плечкайціса. Абаронцай выступае б. прэзыдэнт міністраў Сьляжэвіч.

Голад.

«Слово» (№ 44) паведамляе, што літоўскі габінэт міністраў на апошнім пасяджэньні пастанавіў асыгнаваць яшчэ 4.500.000 літаў з мэтаю закупкі насеньня для земляробаў, пашкоджаных з прычыны неўраджаю. Як вядома, на гэтую мэту было ўжо асыгнавана 10 млн. літаў.

Прадстаўніні ад студэнтаў зьвярнуліся да міністра асьветы з просьбай звольніць ад аплаты за навуку 78 студэнтаў, якія пражываюць у паветах, дзе быў неўраджай.

Статыстыка літоўскага выдавецтва.

У першых днях лютага г. г. у Коўні ў працягу некальких дзён была адкрыта прасавая выстаўка. Свае экспанаты выставілі ўсе выдавецкія таварыствы і рэдакцыі. Аказалася, што ліч кніг новых кніжак асабліва ўзрос у 1928 годзе.

Ад 1914 г. да 1917 выдана 741 кніжка. У 1918 г. выдана 212 кн., у 1919—252, у 1920—423, у 1921—386, у 1922—347 у 1923—285, у 1924—243 і ў 1926—755 кніжак.

Прэса ў 1928 г.

У працягу мінулага году на тэрыторыі Літвы выходзіла агулам 156 пэрыядычных выданьняў, а менавіта: штодзённікаў—17, тыднёвікаў—37, месячнікаў—49 і г. д. з якіх 124 было літоўскіх, 13—нямецкіх, 7—польскіх, 6—расейскіх, 2—яўрэйскіх, 3—літоўска-нямецкіх і 1—у гэбрайскай мове.

АДУСЮЛЬ.

Арышты ў фінскай армії

„Слово" (№ 39) паведамляе, што на Тэрыок на савецка-фінляндзкім пагранічы арыштавана некальні фінляндзкіх вайсковых і цывільных асоб па абвінавачаньні ў камуністычнай прапагандзе.

Замах на польскага консула ў Парыжы.

«Наш Пшэглёнд» (№ 52) паведамляе, што 20 лютага зроблен быў замах на генэральнага консула ў Парыжы, Кароля Пазнанскага. Нейкая асоба, праўдападобна паляк, кінулася з нажом на консула, які шчасьліва ня быў паранены. Нападаўшага арыштавалі.

Абмен вязьнямі з Польшчай.

«Кур'ер Віл». (№ 36) паведамляе, што ў бліжэйшым часе чакаецца ў Маскве падпісаньне польска-савецкай умовы ў справе абмену значнай колькасьці польскіх вязьняў.

Польска-латвійскае паразуменьне.

12 лютага ў Рызе падпісаны Польшчай і Латвіяй тры чыгуначныя ўмовы, патрэбныя дзеля ўвядзеньня ў жыцьцё безпасрэднай польска-латвійскай чыгуначнай камунікацыі.

Новы польскі пасол у Латвіі.

«Слово» (№ 36) паведамляе, што прэзыдэнт Латвіі выказаў згоду на назначэньне новага польскага пасла ў Рызе п. Міраслава Арцішэўскага.

Беспрацоўе ў Англіі ў 1928 годзе.

Процант беспрацоўных у Англіі раўняўся ў працягу 1928 г. 12,2 проц. усіх рабочых. У паасобных акругах сітуацыя прадстаўляецца так: у Лёндане—5,6 проц., паўднёвы ўсход—5,5 пр., паўднёвы захад 8,2 пр., Мідлянд—10 пр., паўночны ўсход—15,2 пр., паўночны захад—12,4 пр., Шкоцыя—11,7 пр., Валія—22,8 пр. і паўночная Ірляндыя—17,1 пр.

Беспрацоўе ў Нямеччыне.

Афіцыяльны бюлетэнь Бэрлінскай статыстычнай управы паведамляе, што ў канцы студзеня г. г. зарэгістравана ў Нямеччыне 2222000 беспрацоўных.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Папулярызацыя новага закону аб сел.-гасп. падатку.

Гомель, 1-III. *Распачата папулярызацыя новага закону аб сельска - гаспадарчым падатку. Выпушчана 70 тысяч лістовак аб падатку, рассылаецца па селішчах розная літаратура аб падатку.*

Склікаецца аб'яднаная нарада працаўнікоў фінаддзелу і земаддзелу для распрацоўкі практычных мерапрыемстваў па прадастаўленьню ільгот па сельска-гаспадарчаму падатку.

У хатах-чытальнях, кутках будуць праведзены гутаркі аб новым сельска-гаспадарчым падатку.

Работніцы вылучаюцца на кіраўнічую працу.

Гомель, 1-III. Сьвяткаваньне 8 сакавіка ў акрузе будзе адзначана адчыненьнем новых ясьляў, дзіцячых пляцовак, дзіцячых садоў і вылучэньнем работніц на розныя працы. Саюзам сельска-гаспадарчых рабочых вылучана работніца Маслава на працу ў ЦП саюзу, жанчына лесаўпарадкавацель—на пасаду начальніка лесаўпарадкаўчай партыі. У 10 савгасах адчыняюцца дзіцячыя пляцоўкі, 3 работніцы вылучаюцца на саюзную кіруючую працу, 8 работніц камандыруюцца на розныя курсы. Забраніравана 10 месц для жанчын у дамы адпачынку і на курорты.

Дэлегаткі РСІ працуюць добра.

ГОМЕЛЬ, 28-II. Да сьвяткаваньня 8 сакавіка рыхтуюцца многія арганізацыі. ЦРК адчыніе два дзіцячых сады, ТДА-Авіяхім арганізуе курсы для жанчын па падрыхтоўцы тэлефаністак, тэлеграфістак, адміністрацыйна-гаспадарчай працы.

Жакты адчыняюць ясьлі ў буйным жакце і правядуць конкурс на лепшы жакт па пастаноўцы жаночай працы. Вылучаны дэлегаткі для абсьледваньня розных установаў гораду.

Трэба адзначыць, што ў некаторых установах недастаткова выкарыстоўваліся прымацаваныя дэлегаткі. Напрыклад, пракуратура рэдка прыцягвае дэлегатак да сваёй працы, не адстае таварыства «Прыяцель Дзяцей», якое слаба ідзе насустрач 7 прымацаваным. Добра працуе 11 дэлегатак у РСІ.

БАРЫСАЎ ДА БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ НЕ ПАДРЫХТАВАЎСЯ.

Ці падрыхтаваны Барысаў да будаўнічага сэзону?

Нарада тэхнічна-гаспадарчых кіраўнікоў адзначыла, што, ня гледзячы на блізкасьць будаўнічага сэзону, многія будаўнічыя арганізацыі канчаткова не падрыхтаваліся да будаўніцтва.

Няма выразнасьці ў асыгнаваных крэдытах, у сувязі з чым будаўнічыя матар'ялы могуць быць падрыхтаваны запозна; будаўнічыя пляны таксама яшчэ не зацьверджаны належнымі ўстановамі.

Адсутнічае плян пабудовы Дому Саветаў, не зацьверджаны акруговым інжынэрам пляны па жыльлёваму будаўніцтву, адсутнічае плян пабудовы дрэваапрацоўчага камбінату „Камінтэрн". Няма асыгнаваньняў на скончэньне будаўніцтва павільёну для хворых на сухоты пры міжрайённай больніцы.

Неабходна ўтварыць грамадзкую думку рабочых аб тым, якія лепш будаваць дамы: малакватэрныя, альбо многакватэрныя. Многакватэрныя ў умовах Барысава абыходзяцца таньней.

Побач з гэтым, адзначаецца, што ўстановамі—культасьветнымі і інш.—дагэтуль не прадстаўлены пляны будаўнічых работ.

І. Клібанаў.

Хто дапаможа арцелі?

Ворша, 1-3. Сельска-гаспадарчая арцель „Новае Жыцьцё" ў м. Крупках ужо даўно хадайнічае перад Крупскім лясьніцтвам і іншымі органамі, каб ёй перадалі ў арэнду смалярню, якую дзержыць у арэндзе прыватнік Ліўшыц Моўша. Гэты прыватнік ня выконвае дагавору з лясьніцтвам і шкодзіць узросту лесу тым, што не заканчвае ям. Лясьніцтва даўно ўжо пачыняла судовую справу, каб спыніць дагавор паміж лясьніцтвам і Ліўшыцам, але справа цягнецца доўга.

Першы раз Аршанскі акруговы суд парашыў у карысьць лясьніцтва і дзейнасьць дагавору спыніў. Але Ліўшыц абскардзіў гэта рашэньне ў Вярхоўны Суд Беларусі і апошні рашэньне адмяніў і перадаў для новага перагляду.

Цяпер акруговы суд зноў вырашыў справу ў карысьць лясьніцтва. Невядома, што толькі скажа і на гэты раз Вярхоўны суд, куды Ліўшыц хоча рашэньне абскардзіць. Можа зноў зацягне справу і тым самым дапаможа прыватніку?

Цяпер арцель чакае ад Вярхсуду дапамогі, бо ўсе мясцовыя ўстановы і арганізацыі з свайго боку падтрымліваюць арцель усімі сродкамі, а акруговы суд, спыняючы дагавор, выносіць правідловае і жыцьцёвае рашэньне. Гэта трэба прыняць пад увагу Вярхоўнаму суду.

Сямігадовая валакіта.

Ворша, 27-2. Сяляне вёскі Майсеяўкі, Горацкага раёну, яшчэ ў 1922 годзе парашылі земляўпарадкавацца. У адпаведныя органы яны падалі заявы і чакалі, што хутка пачнуць працу па земляўпарадкаваньню іх вёскі.

Аднак, в 1922 году і да гэтага часу сяляне вёскі Майсеяўка ніяк ня могуць дачакацца, калі-ж будзе ў іх земляўпарадкаваньне. Сяляне ўжо пазабівала парогі замельных установаў, але дабіцца нічога не маглі.

Кожны раз ім абяцалі распачаць земляўпарадкаваньне з будучага году, бо цяпер не хапае каморнікаў. Сяляне чакалі і царпелі. Некаторыя ўсякую надзею згубілі на тое, што земляўпарадкаваньне ўсё-ж такі праведзена будзе. У гэтым годзе сяляне падалі скаргу ў Аршанскі акрывыканком і апошні, разглядзеўшы яе, вынёс пастанову, у якой прапануецца акруговаму зямельнаму аддзелу в вясны распачаць у вёсцы Майсеяўцы земляўпарадкаваньне і скончыць яго ў гэтым жа годзе.

Адначасова з гэтым акрвыканком вынес таксама-ж пастанову аб перадачы гэтае справы пракурору для прыцягненьня да адказнасьці ўсіх винаватых у гэтай сямігадовай цяганіне і бюракратызьме.

Рыхтуемся да будаўніцтва.

Гомель, 1-3. Падрыхтоўка да будаўнічага сэзону пачынае разгортвацца. На пабудове сельска-гаспадарчага заводу зараз ідуць сталярныя работы, абсталёўваецца механічна-дрэваапрацоўваючая майстэрня па мэханізацыі выпрацоўкі некаторых работ. Сёлета закончыцца будаўніцтва 3-х цэхаў і будуць пабудаваны 4 новыя цэхі.

Здавальняюча праходзяць работы па пабудове двух цагельняў, якія сёлета выпусьцяць да 2 мільёнаў цэглы, а ў наступныя гады вытворчасьць заводаў дасягне 12 мільёнаў штук цэглы. Вядзецца падрыхтоўка да будаўніцтва камбінату ў Новабеліцы, пабудовы ў Гомелі заводу для пераапрацоўкі садавіны і гародніны, крахмальнага заводу ў Засьпе.

На лініі жыжкапасаюзу таксама падвозіцца матар'ял да месца работ.

Першы ўсебеларускі зьезд жанчын КААПЭРАЦЫЙНАГА АКТЫВУ.

Дасягненьні кооперацыі.

28 лютага зьезд абгаварыў даклады прадстаўніка Цэнтрасаюзу т. Бутузавай і БКС т. Багарад аб кааперараваньні жанчын і ўдзеле іх у будаўніцтве кааперацыі.

Тав. Бутузава зазначае, што праца па ўцягваньню жанчын у кааперацыю пачала разгортвацца з 1924 году. Праца ішла па 4 лініях: кааперараваньне, вылучэньне на кіруючую кааперацыйную работу, арганізацыя бытавых установ і прыцягненьне да практычнай працы. Дасягненьні ёсьць, але далёка яшчэ недастаткова наша жанчына ўцягнута ў кааперацыю.

Так, у вясковай кааперацыі ў 1924 годзе жанчын было 275000 чалавек, ці 7,8 проц. агульнага ліку пайшчыкаў, і ў горадзе—847.000 кааперараваных жанчын, або 23 проц. усіх пайшчыкаў. К канцу 1928 году мы ўжо маем у сельскай кааперацыі 1.500.000 жанчын—14 проц. і ў гарадзкой—да 1.800.000 жанчын. Гэта лічбы па Саюзу. У БССР справа стаіць горш: у гарадох жанчыны ў 1928 г. складалі 22 проц. і ў вёсках—10 проц. агульнага ліку пайшчыкаў.

У кааперацыю ў вёсны ў першую чаргу ішлі ўдовы, а ў горадзе—работніцы. Кааперараваньне-ж іншых членаў сям'і праходзіла вельмі слаба і таму для іх установлены зьніжаны пай. Зараз нам прыдасца пераходзіць на дыфэрэнцыяльны пай і яго трэба асабліва папулярызаваць сярод работніц, батрачак і сялянак. Трэба таксама ўцягнуць у кааперацыю жанчын в калгасаў.

Жанчыны-актывісткі павінны прыняць самы актыўны ўдзел у вярбоўцы ў кааперацыю жанчын. Нашай кааперацыі трэба падумаць аб пашырэньні бытавых установаў, бо існаваньне іх зацікавіць жанчыну, і яна ня толькі пойдзе ў кааперацыю, але і будзе актыўна ў ёй працаваць.

Спыняецца т. Бутузава і на росьце грамадзкага харчаваня, якое мае вялікае значэньне ў разьвіваньні жанчын. У 1923 годзе па Саюзу было 42 сталоўкі, а ў 1927 г. кааперацыя іх налічвае 775 з выдачай штодзень 500.000 абедаў. Бязумоўна, гэтага мала, і трэба ў далейшым весьці працу па разгортваньні грамадзкага харчаваньня. Жанчыны павінны прыняць удзел у арганізацыі гарачых сьняданьняў у школах.

У нашых сталоўках харчуюць ня зусім добра: меню алнастайнае, страва не заўсёды смачная. Жанчыны-работніцы павінны дапамагчы зьнішчыць гэтыя недахопы.

Кааперацыя мае дасягненьні і ў галіне хлебапячэньня: у 1925 годзе было 476 хлебапякарняў, а ў 1927 г. 623; па ўсіх буйных гарадох працуюць 11 хлебазаводаў і будуецца 17 новых.

Кааперацыя па Саюзу мае 291 ясьлі, 831 дзіцячы сад і пляцовак, будуюцца 3 пральні і г. д. Усё гэта мае на ўвазе аблягчыць жыцьцё і працу жанчыны. На бытавыя ўстановы і працу ў 1927-1928 годзе выдаткавана 2000000 руб., а сёлета будзе ўжо 5.000.000 руб.

Але сродкаў кааперацыі для яшчэ большага павялічэньня гэтых мерапрыемстваў ня хапае. Нашай жанчыне ў горадзе і вёсцы трэба мабілізаваць сродкі насельніцтва на арганізацыю большага ліку бытавых установаў.

Аб чым гаварылі дэлегаткі зьезду.

Па дакладах было пададзена шмат запісак, а ў спрэчках выказалася звыш 30 дэлегатак зьезду.

Тав. Макрушыц знаходзіць, што бытавыя ўстановы далёка не ахопліваюць патрэб пайшчыц. Менскаму ЦРК няма чаго баяцца разгортваць сетку дзіцячых садоў і іншых установаў. Калі кааперацыя будзе мець належна пастаўленыя бытавыя ўстановы, тады лягчэй будзе праводзіць кааперараваньне насельніцтва. Жанчыны скардзяцца, што з імі ня лічацца на мясцох, але на гэта ня трэба глядзець і трэба ісьці актыўна працаваць у кааперацыю.

Скардзіліся дэлегаткі, што іх ня клічуць на пасяджэньні і наогул не даюць практычнай працы ў кааперацыі; дэлегаткі гавораць, што ім самім трэба павесьці рашучую барацьбу за актыўны ўдзел жанчын ва ўсім будаўніцтве і працы кааперацыі. Адзначалі дэлегаткі і тое, што рэвізійныя камісіі робяць рэвізіі раз у год. Трэба ў рэвкамісіі выбіраць больш жанчын, і тады гэтай недарэчнасьці ня будзе, бо жанчына цікавіцца працай кааператыву і ёй больш, чым мужчыне, прыходзіцца мець справу пры пакупцы розных прадуктаў.

Тав. Зельдзіна (Новабеліца) зазначае, што праўленьне ЦРК толькі раз у год склікае сход упаўнаважаных, а гэта нікуды ня варта. Трэба ўпаўнаважаных знаёміць з штодзённай працай і ўцягваць іх у гэту працу.

— Кепска тое,—кажа т. Кторман,—што мы жанчыны ў кааперацыю ўцягваем толькі ад кампаніі да кампаніі. Гэту працу трэба праводзіць штодзённа і ўпарта, і тады у нас будуць добрыя вынікі ў галіне кааперараваньня жанчын.

Шмат дэлегатак скардзіцца на недастатковую колькасьць дзіцячых садоў, ясьляў і іншых бытавых установаў. Дэлегаткі зазначалі, што трэба самім жанчынам узяцца за арганізацыю гэтых установаў прыцягваючы сродкі насельніцтва і грамадзкіх арганізацый.

Жанчын трэба ўцягнуць і ў працу па загатоўках, бо спецы-загатоўшчыкі часам бываюць з варожага нам элемэнту—былыя гандляры і г. д., якія ўносяць у загатоўчую працу спэкуляцыю, а жанчына будзе працаваць сумленна.

Усе дэлегаткі прыходзілі да выводу, што жанчынам - актывісткам трэба прыняць самы актыўны ўдзел у перавыбарчай кампаніі кааперацыі, ня даць пралезьці ў кіруючыя органы кулакам.

ДВУХТЫДНЁВІК АШЧАДНАСЬЦІ.

ТЭМП РАЗГОРТВАНЬНЯ КАМПАНІІ НЕДАСТАТКОВЫ.—БАБРУЙСКАЯ АКРУГА ІДЗЕ НАПЕРАДЗЕ.—НА МЯСЦОХ НЯМА ПРАВЕРКІ ВЫКАНАНЬНЯ ДАДЗЕНЫХ ДЫРЭКТЫЎ.—САЮЗЫ ПАКУЛЬ ШТО СЛАБА ЎДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ У КАМПАНІІ.

Падрыхтоўчы пэрыяд да кампаніі скончан. Зараз распачалася паласа непасрэднай інтэнсыўнай працы па правядзеньню кампаніі. Па даных, атрыманых з акруг, можна сьцьвердзіць, што ў асноўным ва ўсіх акругах падрыхтоўчая праца да кампаніі праведзена здавальняюча.

Дырэктывы, дадзеныя акруговымі органамі па ўсіх лініях, зьяўляюцца дастатковымі; акруговыя камісіі разгарнулі сваю дзейнасьць і, бязумоўна, аказваюць станоўчы ўплыў на ход кампаніі. Выключэньне ў гэтым сэнсе складае менская камісія, якая ніяк не магла сабрацца. Толькі 28-II менская камісія, урэшце, прыступіла да працы.

Даныя, атрыманыя з акруг (Віцебск, Магілеў), сьведчаць аб тым, што кампанія разгортваецца недастатковым тэмпам. Гэты тэмп, калі ён неадкладна ня будзе павышан, стварае пагрозу невыкананьня 100 проц. заданьня.

Асабліва слаба разгортваецца праца на вёсцы. Тыя вынікі, якія да сёньняшняга дню ёсьць ва ўсіх акругах адносна ўцягненьня сялянскіх укладчыкаў, гавораць аб тым, **што на вёсцы няма яшчэ таго зруху, які павінен быў быць дасягнуты нават ужо ў падрыхтоўчы пэрыяд.**

Толькі ў Бабруйскай акрузе, якая разгарнула кампанію вельмі інтэнсыўна, ёсьць ужо досыць здавальняючыя вынікі: па акрузе з 1 да 25 лютага ўцягнута 3.000 укладчыкаў на 95 тысяч рублёў фізычных укладаў; маем некаторы пералом і на вёсцы.

Пры гэтым трэба адзначыць, што ў той час, калі мы па Бабруйскай акрузе ў цэлым маем здавальняючыя вынікі, дык у паасобных раёнах назіраем вельмі разнастойны малюнак: наперадзе ідуць: Слуцкі раён, які выканаў 67 проц. кантрольнага заданьня і Асіпавіцкі—58,3 проц. Менш здавальняючыя вынікі дасягнуты: у Старобінскім раёне—33 проц., Рагачэўскім—25 проц. і Жлобінскім—24 проц. Зусім слаба абстаіць справа ў Глускім раёне—4 проц., Клічаўскім—5,6 проц., а ў Парыцкім раёне нічога ня зроблена—выканана толькі 0,9 проц.

Цікавы вопыт праведзен у Жлобінскім раёне: райкомам КП(б)Б даюцца ўсім выяжджаючым з раёну работнікам канкрэтныя заданьні аб ўцягненьні вызначанай колькасьці ўкладчыкаў. Такім чынам, у Жлобінскім раёне скарыстаны ўсе выезды ў с-с, умоцнена праца на мясцох і разам з гэтым дасягнуты практычныя вынікі, бо ўсе заданьні, як паказала практыка, выконваюцца.

На прыкладзе Бабруйскай акругі мы яскрава бачым, як раённыя органы па-рознаму выконваюць дырэктывы аб разьвіцьці ашчаднай справы і можам канстатаваць, што ў Глускім, Клічаўскім і Парыцкім раёнах не падышлі сур'ёзна да гэтай важнай кампаніі.

У чым «корань небяспекі»?

Галоўным чынам, у тым, што мясцовыя органы абмяжоўваюцца дачай дырэктыў, роўнадзежна не арганізаваўшы праверкі іх выкананьня.

Вось чаму на пасяджэньні Цэнтральнай Камісіі пры Прэзыдыуме ЦВК было пастаноўлена зьвярнуць увагу ўсіх акруговых камісій на неадкладную праверку па ўсіх лініях выкананьня дадзеных дырэктыў і распрацаваных на мясцох плянаў. Пры гэтым Цэнтральная Камісія адзначыла недастатковасьць тэмпу ходу кампаніі і запрапанавала акругам прыняць самыя рашучыя меры да яго ўзмацненьня.

Цэнтральная Камісія таксама канстатавала слабы ўдзел прафсаюзных арганізацый у кампаніі. Як высьветлілася, саюзы абмежаваліся толькі дачай дырэктыў, а некаторыя з іх зусім дырэктыў па «двухтыднёвіку» не давалі.

У галіне праверкі фактычнага выкананьня дырэктыў саюзамі нічога ня зроблена. У зьвязку з гэтым нарада пры ЦСПСБ прыняла шэраг рашэньняў, накіраваных да забесьпячэньня сапраўднага актыўнага ўдзелу саюзных арганізацый у «двухтыднёвіку» і праверкі правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў, дадзеных ЦСПСБ і цэнтр. праўленьнямі саюзаў.

У зьвязку з тым, што падрыхтоўчы пэрыяд ня даў жаданых практычных вынікаў (акруга Бабр. акругі), сакавік месяц павінен быць месяцам самай актыўнай і энэргічнай працы ашчадапарату, так і ўсёй грамадзкасьці, бо фактычна выкананьне ўстаноўленых для кожнай акругі, раёну і с-с кантрольных лічбаў залежыць ад тэмпу працы ў бягучым месяцы.

Вось чаму акруговыя і раённыя камісіі садзейнічаньня павінны разьвіць у сучасны момант самую інтэнсыўную дзейнасьць і прыняць меры да сапраўднай рэарганізацыі той спрыяючай абстаноўкі, якая ўтворана вакол ашчаднай справы.

Палеес.

У КАСЬЦІСТЫХ ЛАПАХ ГОЛАДУ.

Усё больш і больш галосьней становіцца весткі аб голадзе, якія даходзяць да нас з Зах. Беларусі. Аграмадная частка ўсёй ЗБ (Віленскае і Навагрудзкае ваяводзтвы) ахоплена была ў гэтым годзе вострым неўраджаем. Сяляне не сабралі нават і 30 проц. звычайнага і «нармальнага», у абставінах Зах. Беларусі, ураджаю. Ужо да канца лістапада—сьнежня сяляне дазналі астаткі хлеба, пераходзячы на бульбу. Апошнія паведамленьні кажуць аб тым, што і бульба становіцца родкім госьцем у галодных хатах заходняй-беларускіх сялян. Масава распраددецца за бясцэнак жывы і мёртвы інвэнтар. Галодная сьмерць навісла над шматтысячнымі масамі працоўнага сялянства.

Буржуазная преса стараецца ўсімі сіламі зьмяншыць значэньне і разьмеры голаду і неўраджаю. Але нават па антымістычных заявах урадоўцаў можна мець прадстаўленьне—як вялік ахапіўшы Зах. Беларусь голад.

— У Віленскай газэце „Слово" ад 17-II кресавы зубр абшарнік Гечэвіч у спэцыяльным інтэрв'ю, адказваючы на пытаньне «як вялікі разьмеры голаду», кажа: «цяжка вызначыць гэта лічбамі. Злыбеда голаду ў гэтым годзе выключна вялікая. Нармальна, у многіх сялян не выстарчае запасаў хлеба, але адсутнасьць яго яны запаўняюць бульбай. У гэтым годзе няма бульбы. У кожным разе не вельмі мала, што стварае безвыходную сітуацыю»... Гэты-ж самы зубр сапраўдне, што—«яе[illegible]ца ўжо весткі паштовага зьвяра аб галодным тыфусе ў Браслаўскім павеце». Весткі аб хваробе ідуць ня толькі з Браслаўскага павету, але і з Віленска-Троцкага, Ашмянскага, Маладэчанскага і інш. Хоць газэты і зьяўляюць толькі аб «асобных» выпадках галоднага тыфусу, але нам добра вядома, што хвароба прымае масавы характар і што выпадкі галоднай сьмерці павялічваюцца в кожным тыдні. Па афіцыяльных урадавых даных, у Віленскім ваяводзтве 61 тысяча дарослага насельніцтва і 21 тысяча дзяцей у школьным узросьце патрабуюць арганізацыі пасіленьня. Але гэта кажуць урадавыя даныя! У рэчаістасьці лічбы значна большыя, лічбы кажуць аб сотнях і тысячах галадаючых.

Урадавая преса, імкнучыся замазаць рэчаістасьць становішча, выяўляе голад як вынік толькі неўраджаю, як вынік „божай ніласкі", як вынік забітасьці і некультурнасьці беларускага селяніна. «Селянін вінават"—кажуць—правіцелі, стоючы перад фактам голаду, набіраючага пагражаючыя разьмеры.

Але нам зусім ясна, што голад і неўраджай зьяўляюцца вынікам усёй палітыкі польскага фашызму. Страшэннае безьвыхадзьце, сталая нужда, вострае пераладненьне вёскі, цяжкае прыгнечаньне дыктатуры фашызму, бязьмежная ўлада абшарніка—вось праўдзівыя прычыны ахапіўшага Зах. Беларусь голаду. Сам абшарнік Гечэвіч гаворыць аб „нармальнасьці" таго факта, што селяніну звычайна невыстарчае хлеба нават [illegible] хлебазаньне і што ён змушан аджыўляцца бульбай. Зусім «нармальным» у абставінах фашыстаўскай дыктатуры зьяўляецца тое, што селянін ЗБ валочыць нэндзнае, напоўгалоднае існаваньне на дробным кавалку зямлі. Зусім «нармальным» у абставінах фашыстаўскага панаваньня зьяўляецца эксплёатацыя абшарніка, кулака, ліквідацыя сэрвітутаў, кабальныя крэдыты і... голад, як нуўхільны гось

НАПЯРЭДАДНІ ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ.

СЛАБА ІДЗЕ ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ. ТРЭБА ДАБІЦЦА РАШУЧАГА ПАЛЕПШАНЬНЯ ГЭТАЙ ВАЖНАЙ СПРАВЫ.

ШТО ДАЕ ПРАЦОЎНАМУ СЯЛЯНСТВУ НОВЫ ЗАКОН АБ С.-Г. ПАДАТКУ.

Новае «Палажэньне пра с.-г. падатак» дапаўняе і пашырае пастанову Саюзнага ўраду за 8 лютага. Зьмены с.-г. падатку ідуць па 2-х напрамках: даюцца значныя скідкі за пашырэньне пасяўной плошчы, распашку новых зямель, палепшаньне жывёлагадоўлі; з другога боку падлягаецца абкладаньне працоўнага і шмат'ядоцкага двара.

Выключна-важнай зьяўляецца льгота за правядзеньне прасьцейшых мерапрыемстваў для падвышэньня ўраджайнасьці. Закон пералічвае іх: 1) зьнішчэньне межаў; 2) засяваньне чыстагатункавым насеньнем; 3) пратраўліваньне, ачышчэньне і сартаваньне ўсяго насеньня; 4) радавы пасеў; 5) зьнішчэньне пустазелля і шкоднікаў; 6) раньні папар; 7) заняты папар; 8) так званая «зяблёвая» ўспашка; 9) спыненьне пасьбы жывёлы на азіміне; 10) палепшаньне ўмоў утрыманьня жывёлы, напрыклад, арганізацыя ўцепленых хлявоў; 11) засеў зялёных угнаеньняў. Просты пералік паказвае, што кожнае з гэтых мерапрыемстваў можа правесьці як паасобны гаспадар, так і ўся вёска. Між тым, калі хоць адно з іх будзе праведзена ўсёй вёскай, дык кожны гаспадар (апроч абкладзеных індывідуальна) атрымае скідку ў 10 проц. падатку. Калі-ж гэта мерапрыемства правядуць паасобныя гаспадары, кожнаму з іх дасьцца скідка ў 5 проц. падатку. Звыш таго, закон дазваляе акрывыканкомам вызначаць і іншыя мерапрыемствы, за правядзеньне якіх дасьцца паказаная скідка.

Спэцыяльныя льготы прызначаюцца для гаспадароў, якія пашыраюць насеўную плошчу. Калі селянін распаша «залеж» (пакіаўтую зямлю), ці «цаліну» (зямлю, якая ніколі не ўзорвалася), дык гэта распашка вызваляецца ад абкладаньня на 2 гады. У раёнах, дзе абкладаецца пасеў (напрыклад, у Мазырскай акрузе), зусім вызваляецца ад падатку ўвесь прырост пасеўнае плошчы за 1929 і 1930 гады ў параўнаньні з 1928 г. Такім чынам, селянін тут можа павялічыць плошчу пасеву ўдвойчы, а плаціць будзе аднолькава. Апроч таго, у такіх пасеўных раёнах дасьцца 15 проц. скідкі з нормаў даходнасьці зямлі тым гаспадаркам, якія перайшлі на шматпольле. А падатак у зьвязку з гэтым паменшыцца больш як на 15 проц.

Калі гаспадар пад наглядам агранома завядзе дасьледчае поле з якой-небудзь новай культурай, ці новы спосаб апрацоўкі зямлі, дык плошча гэткага поля (да 1/3 дзесяціны на гаспадарку) зусім вызваляецца ад абкладаньня.

Побач з льготамі па падаходзтву даюцца вялізарныя льготы малочнай жывёлагадоўлі. У раёнах, дзе выраб масла набыў таварны характар, леташнія нормы даходнасьці ад кароў зьмяншаюцца напалову, а пасевы траў (канюшины, вікі і інш.) абкладаюцца ня як пахоць, а як заліўны луг, гэта значыць у меншых разьмерах. Сьпіс раёнаў БССР, на якія пашыраецца гэтая льгота, у хуткім часе будзе вызначан урадам.

Закон захоўвае і ўсе леташнія сельска-гаспадарчыя льготы. Плошчы нязыгадных зямель, ізаляваньне за кошт землякарыстальніка, вызваляюцца ад падатку на 3 гады. Не абкладаюцца плошчы, на якіх летась рабілася раскарчоўка вырубанага раней лесу. Плошчы, занятыя на насеньне культурных траў, таксама не абкладаюцца. У раёнах прамысловага льнаводзтва пасевы лёну абкладаюцца на палавінных нормах. Зусім не абкладаюцца быкі і жарабкі—вытворнікі, уведзеныя зямельнымі ўстановамі, авечкі з заводзкіх рассадзікаў і грамадзкія кнары злучных пунктаў.

Каб палегчыць машынізацыю сельскай гаспадаркі, закон моцна зьніжае абкладаньне даходу ад машын. Даход ад нескладных машын, а таксама ад трыераў і сартыровак зусім не абкладаюцца. З даходу ад іншых складаных машын запісваецца пад абкладаньне ня ўся сума (як летась), а наступныя часткі: па машынах з механічнымі рухавікамі—ад 25 да 50 проц., ад машын бяз рухавікоў—ад 10 да 25 пр.

Старанная працоўная гаспадарка павінна зрабіць з гэтага толькі адзін вывад: «Варта пашыраць пасевы і палепшаць гаспадарку, бо даход павялічваецца і падатак памяншаецца».

Абкладаньне шмат'ядоцкіх і працоўных гаспадарак зьмяншаецца наступным чынам: зьніжаюцца процантныя надбаўкі і, апроч таго, шмат'ядоцкім дварам робяцца асобныя скідкі.

Даход усіх гаспадарак вылічваецца па сярэдніх нормах даходнасьці. Летась, калі сума гэтага даходу перавышала 400 руб., дык да яе рабілася процантная надбаўка ад 5 да 25 пр., зважаючы па разьмерах гаспадаркі. Сёлета надбаўкі будуць рабіцца толькі з даходу звыш 500 руб. і гранічны разьмер іх—10 проц. Апроч таго, надбаўкі скасоўваюцца для гаспадарак, якія ня маюць уласнае цягавае сілы (каня ці вала) інвэнтару і прымушаны наймаць іх. Таксама надбаўкі ня будуць рабіцца для тых шмат'ядоцкіх гаспадарак, абкладаемы даход якіх на 1 едака не перавышае: пры 9 і 10 едаках—60 руб., пры 11 і 12 едаках—65 руб., пры 13 і больш едаках—75 руб.

Разам з тым шмат'ядоцкім гаспадаркам даюцца скідкі з налічанага падатку ў наступных разьмерах: пры 7 і 8 едаках—5 процантаў, пры 9 і 10 едаках—10 проц., пры 11 і больш едаках—15 проц.

Урэшце адзначым, што закон забараняе на працягу 3-х год падвышаць тыя стаўкі падатку і нормы абкладаемага даходу зямлі і жывёлы, якія будуць устаноўлены ў 1929-30 годзе. Гэта азначае амаль поўную стабілізацыю аклада падатку для працоўных і сярэднцкіх гаспадарак. Селянін цяпер мае магчымасьць будаваць свае гаспадарчыя плыны на шэраг год і не чакаць павялічэньня падатку.

Такім чынам, новы закон дае стараннаму працоўнаму селяніну вялізарныя льготы. Але трэба, каб ён скарыстаў іх. Закон аб сельска-гаспадарчым падатку яшчэ не дайшоў да шырокіх колаў вёскі. Задача партыйных, савецкіх і грамадзкіх устаноў і арганізацый—у бліжэйшы час шырока папулярызаваць новы сельска-гаспадарчы падатак.

Сялянка-вылучэнка
САМАХВАЛАВА.

СЛАБА, ТРЭБА ПАДЦЯГНУЦЦА.

(Ад нашага ўласнага карэспандэнта).

АБ ПЛЯНАХ І ПЛЯНАВАСЬЦІ.

У складаньні пляноў да пасеўкампаніі ў установах поўная неразьбярыха. Кожная з іх устанаўляла свой тэрмін падрыхтоўкі да сяўбы. Калі, напрыклад, акруговы земельны аддзел свой плян правядзеньня веснавой пасяўной кампаніі склаў у лістападзе месяцы, дык акрсельсаюз і калгассаюз склалі свае пляны толькі ў другой палове студзеня месяца. Па лініі камітэтаў сялянскай узаемадапамогі плян веснавой пасяўной кампаніі складзен быў толькі 6 лютага.

Такое становішча з плянамі прывяло да таго, што акрсельбанк ня меў магчымасьці арыентавацца з выдачай кредытаў і распачаў выдачу іх вельмі позна.

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫЯ МАЙСТЭРНІ—НА ПАПЕРЫ.

У свой час шмат гаварылася аб арганізацыі сельска-гаспадарчых майстэрняў. Вызначаны былі сродкі, але да гэтага часу акрземаддзел яшчэ ня выдаў 15 тыс. рублёў на гэтую мэту, упаўнаважаны Белсельтрэсту не патурбаваўся яшчэ аб арганізацыі такіх майстэрняў пры савгасах. Такое самае становішча назіраецца і па лініі камітэтаў сялянскай узаемадапамогі.

КРЫХУ АБ КІРАЎНІЦТВЕ ПРАЦАЙ.

Аб жывым, добра наладжаным кіраўніцтве працай падрыхтоўкі да сяўбы на месцах з боку акруговых устаноў нечага і гаварыць. Яго ня было. Аб гэтым сьведчаць тыя факты, што акруговы агранам выяжджаў, напрыклад, у райён на падрыхтоўцы да веснавой сяўбы толькі адзін раз. Яго кіраўніцтва» дайшло да таго, што на паперках важнага зьместу аграманіяй акрэа накладаецца рэзалюцыя «да ведама».

Акруговая аграманія пасылае ў Наркамзем зьвесткі аб майстэрнях (аб якіх гаварылася раней, што яны яшчэ не арганізаваны), як аб існуючых.

АЧЫСТКА НАСЕНЬНЯ ІДЗЕ СЛАБА.

Вынікі зернаачышчальнай работы гавораць аб тым, што тэмп гэтай працы вельмі слабы. На 15 лютага па акрузе ачышчана толькі 3 тыс. тон. насеньня або 18 проц. гадавога заданьня. Округа мае ў сваім распараджэньні 250 зернаачышчальных машын. Прыняўшы пад увагу, што насеньне можна чысьціць да 15 кампаніі, на пазіцыі і паклаўшы на кожную машыну ў дзень 30 пудоў насеньня, прыходзіцца канстатаваць, што плян ачысткі насеньня будзе выпаўнен толькі на 75 проц., калі праца гэтая ня будзе ўзмоцнена.

ПЛЯНУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ПАГРАЖАЕ ЗРЫЎ

Пляну калектывізацыі і вытворчага каапераваньня пагражае зрыў і Акрсельсаюз ня прымае ніякіх захадаў да палепшаньня працы. Па пляну павінна быць арганізавана 70 калгасаў, а арганізавана толькі 16, павінна быць арганізавана 70 паселькових таварыстваў, а арганізавана толькі тры, насенняводных таварыстваў, якіх вызначана па пляну арганізаваць шэсьць, не арганізавана ніводнага і г. д.

ЧАСТКА ВІНЫ ПАДАЕ НА ЦЭНТР.

Значную долю віны кепскага становішча падрыхтоўкі да веснавой сяўбы трэба аднесьці на рахунак цэнтральных устаноў. Возьмем прыклады. На насу вясна, а Наркамзем яшчэ не перавёў грошы на арганізацыю агракурсаў (900 руб.) ня прыслаў працаўнікоў для кіраваньня гэтымі курсамі. У сваю чаргу Белсельбанк тармозіць працу Акрсельбанку цягаціной з зацьвярджэньнем кредытнага плану, чакаючы, пе, як спыняцца савецкая канкуренцыя, дык цэны на бензыну павялічацца.

Водуг вестак газэты, супрацоўніцтва канбінату з Нафтасынцыгатам можа вылыцца або ў прапарцыянальным разьмеркаваньні долаў увозу ў Англію, або ў згодзе наконт цэн.

Рыхтуюцца, але ня ў

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэн

ЛЕТАМ РЫХТУЙ ПАЛАЗЫ, А ЗІМОЙ КАЛЁСЫ.

Райён зараз узмоцненым тэмпам рыхтуецца да вясеньняе сяўбы. Зернаачышчальная кампанія ахапіла ўсё сялянства. Райённыя працаўнікі спачатку ведалі, што налічных сартыровак ня хопіць, а таму «адарвалі» ад бюджэту грошы і накіравалі ў округу з умовай, што за іх прышлюць патрэбныя машыны.

Заўсёды бюракратычная округа на гэты раз аказалася далікатнай і адзывчывай—просьбу райёну задаволіла. А праз тыдзень цягнік прывёз партыю малатарняў з арфамі... Выходзіць, што праз барабан малатарні неабходна пашаніцу сартыраваць, а праз сіты «Трыумфа» авёс малаціць. А мо' акруговыя працаўнікі залішне ўцялілі народную прыказку—„Летам рыхтуй сані, а зімой калёсы". Як-бы там мібыло, а за такія „камбінацыі" „кой кого" і «кой за что» неабходна правусьціць праз сартыроўку з рашоткай-сітам напраўчага дому.

„САРТЫФІКАТ НА НАСЕНЬНЕ".

Чытач ня ведае, што гэта знача—«сартыфікат на насеньне». Два словы быццам нічога ня кажуць «ні розуму, ні сэрцу». І нам пагэтаму незразумелым будзе хваляваньне райгранома Талочыншчыны тав. Герасімава.

— Аналізаў—сартыфікатаў на насеньне няма. Мы ня ведаем, на колькі процантаў будзе мець усходжасьць насеньня, якое маркуецца завезьці ў наш райён.

Хваляваньні Герасімава маюць прычыну. Я ведаю прыклад Дрыбінчыны, дзе якраз была такая недарэчнасьць у мінулым годзе. У райён быў прывезены вагон аўса. Сартыфіката—аналіза на яго ня было. Праверыць усходжасьць некалі было—сяўба ўжо тызьнень назад распачалася. Насеньне было раздадзена беднаце. А праз два тыдні на райёне гвалт, гарыдар:

— Насеньне аўсу написаванае. Больш чым напалову ня ўзышло...

Такі выпадак—жудасны, надрыўны выпадак можа паўтарыцца і ў Талочынскім райёне. Трэба хвалявацца не адному райгрупому, а ўсёй грамадзкасьці Талочыншчыны. І ня толькі хвалявацца, ня толькі адчыняць гаварыльню, а прымяць, кажучы мовай бюракрата,—«тэрміновыя меры да зьнішчэньня такога зьяўішча».

АВЁС З ВОЛГІ.

Наркамзем яшчэ ў лістападзе разаслаў загад аб забароне вывазу ільнасеня з райёнаў, але для загатоўкі з Талочына гэта не закон—ільнасеня вывозіцца ў другія райёны.

— Дзяпрасаюз забараніў нам вывозіць авёс і ячмень, а вось наконт ільнасеня мы нічога ня ведаем. Гэта іх матывіроўка.

Прывітаньне ўраду БССР.

Будаўнікі Гомелю, сабраўшыся для выбараў гарсавету, шлюць гарачае прывітаньне Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту Беларусі.

Даючы наказ сваім дэлегатам у гарсавет аб далейшым узмацненьні сацыялістычнага будаўніцтва, ПРОСІМ ЦВК АБ ХУТЧЭЙШЫМ ВЫПУСКУ 3-Й ПЯЗЫІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

Нахай жыве Савецкая Беларусь!

Нахай жыве Рэспубліка Саветаў усяго сьвету!

ПРЭЗЫДЫУМ.

У Савеце Народных Камісараў.

27-го лютага г. г. адбылося чарговае пасяджэньне Савету Народных Камісараў пад старшынствам тав. М. М. Карклі на. На гэтым пасяджэньні разам з іншымі разглядаліся наступныя пытаньні

Санітарнае становішча БССР і дзейнасьць санітарных органаў.

СНК выслухаў даклад Народнага Камісара Аховы Здароўя тав. Барсукова аб санітарным становішчы БССР і аб дзейнасьці санітарных органаў.

Санітарнае становішча БССР пакуль што яшчэ цяжкае. У выніку вайны і масавага руху насельніцтва стварыліся цяжкія санітарныя ўмовы, якія ў значнай меры адбіліся на здароўі працоўных, на расаўсюджваньні цэлага шэрагу эпідэмій і сацыяльных хваробаў і далі значны рост захваранняў насельніцтва ў першыя гады савецкага будаўніцтва. І толькі ва ўмовах мірнага савецкага будаўніцтва мы пачынаем выходзіць з цяжкага санітарнага становішча, якое дасталося нам у спадчыну ад мінулага. Настойлівасьць у правядзеньні супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў мела вынікам паступовае зьніжэньне эпідэмічных захваранняў, аб чым сведчаць такія, напрыклад, як спынка савецкая канкуренцыя, дык цэны на бензыну павялічацца.

Водуг вестак газэты, супрацоўніцтва канбінату з Нафтасынцыгатам можа вылыцца або ў прапарцыянальным разьмеркаваньні долаў увозу ў Англію, або ў згодзе наконт цэн.

„БЛІЗЯЦЦА РАДЫКАЛЬНЫЯ ЗЬМЕНЫ"

«ГАЗЭТА ВАРШАЎСКА» АБ РОСЬЦЕ ЦІКАВАСЬЦІ НА ЗАХАДЗЕ ДА СССР.

ВАРШАВА, 28-II. Орган эндэкаў «Газэта Варшавска» агаласіў артыкул, у якім адзначаецца агульная цікавасьць чужаземных капіталістаў да СССР. Аўтар артыкулу тлумачыць гэта пашырэньнем у капіталістычных краёх эканамічнага крызісу, які прымушае капітал шукаць новых рынкаў збыту.

«Адначасна,—зазначана ў артыкуле,—трэба чакаць радыкальных зьмен у палітыцы капіталістычных дзяржаў у адносінах да СССР. Аб заснаваньні антысавецкага фронту зараз ня можа быць і гутаркі».

ПОСЬПЕХ СССР.

...ай згодзе.

...дае магчымасьць парыальна рэалізаваць савецкія нафтапрадукты ў Англіі.

Згода падпісана на 3 гады. Яна ЗАБЯСПЕЧВАЕ НАМ ВЫВАЗ І РАЗЬМЯШЧЭНЬНЕ НА АНГЕЛЬСКІМ РЫНКУ БЛІЗКА 1-ГО МІЛІЁНУ ТОН НАФТАПРАДУКТАЎ ШТОГОДУ.

Згода будзе ў значнай меры спрыяць стварэньню нармальных камэрцыйных варункаў на ангельскім рынку, і азначае, што фактычна ўсе прадстаўленыя памянёнай англа-амэрыканскай кампаніяй фірмы па гандлі нафтапрадуктамі на ангельскім рынку, у тым ліку і кампанія Дэтэрдынга, згадзіліся па заснаваньне рэгулярных гандлёвых зносін з савецкімі гаспадарчымі органамі. Згода, бясспрэчна, зьяўляецца станоўчым фактам з пункту гледжаньня гаспадарчых інтарэсаў Савецкага Саюзу. Падпісаньне 3-хгадовага ўгавору азначае калі ня поўнае спыненьне актыўных варожых выпадаў проці СССР з боку некаторых нафтавых арганізацый, дык ва ўсякім разе, сур'ёзны пералом у іх адносінах да СССР.

Вельмі магчыма, што падпісаньне «мірнага ўгавору» ў Англіі аб рэалізацыі савецкае нафты мае таксама сувязь з настроямі некаторае часткі ангельскіх фінансавых і прамысловых колаў, якія ўсё больш пераконваюцца ў карысьнасьці і мэтавгоднасьці палепшыць адносіны, якія зараз існуюць між Англіяй і СССР».

На пераглядзе справы кіраўніцтва Грамады (засуды...

...надзвычайна вялікі час катэргі...лася беларуская грамадзкасьць. ...арышты. Паліцыя канфіскавала ...абароны. Распаўсюджана вялічэ...

Арышты ў Вільні

ВАРШАВА, 28-2. У часе неп... арыштаваны 22 чалавекі.

Колькі пратрывае

«Слово» (№ 49) паведамляе...ска-Работніцкай Грамады" пра...

Суд над адным

25 лютага ў віленскім акруговым суд... разьбіралася справа Лявона Мэнка, абві...вачанага ў прыналежнасьці да «Бел. С.-...Грамады". Акт абвінавачаньня, як і ...уоіх іншых працэсах „Грамады", зак...абвінавачаному, што ён ад 1926 г. ...адным з антыўпейшых членаў «Грамады» ...што ён працаваў разам з камуністычны...дзеячамі П. Цьвятковым, Макоўскім і Б...ровічам, што ён арганізаваў у Вільні м...цовы гурток і быў сабраны яго камітэ...пісаў артыкулы ў органы «Грамады», п...вадыроставаў маніфэстацыямі 8, 11, і ...сьнежня 1927 г. і г. д.

СУПРОЦЬ ФАШ...

Патрабуем вызвал... грам...

(На сходзе ка...

28-га лютага ў доме асьветы адбы...аб'яднаны сход супрацоўнікаў калекты...—Беларускай Акадэміі Навук, Навук...Дасьледчага Інстытуту Сельскай і Л...Гаспадарчі імя Леніна і 8-га групкому...якім была заслухана інфармацыя т. ...КРАШЕВІЧА аб апошніх падзеях у Зах...ній Беларусі. У сваім дакладзе т. Не...шэвіч спыніўся на разгроме Беларус...Сялянска-Работніцкай Грамады польс...фашысцкім урадам і аб фашысцкіх м...нацыях закон апэляцыйнага працэсу.

Па дакладу т. Некрашэвіча выступіў ...месьнік старшыні Галоўнай Управы ...Беларускай Школы Заходняй Беларусі ...отаўнік Віленскай Беларускай Гімн...т. Савіцкі, які прадэманстраваў факт...вьдзекі і ўцёск фашысцкага ўраду П...шчы над беларускім нацыянальна-соцы...ным рухам.

Сход прыняў наступную РЭЗАЛЮЦ...Аб'яднаны сход культурна-асьвет...працаўнікоў Народнага Камісарыяту Асв...ты, Беларускай Акадэміі Навук, Навук...Дасьледчага Інстытуту Сельскай і Л...Гаспадарчі імя Леніна, Беларускага Д...жаўнага Музэю і Цэнтральнага Архіў...Менску, заслухаўшы інфармацыю аб ас...ніх падзеях у Заходняй Беларусі, з г...бокім абурэньнем канстатуе новую пра...белага тэрору польскага фашызму.

Ганьба здрадн...

(Рэзалюцыя надзвычайнага агу...

Заслухаўшы даклад сэкратара бю...ячэйкі МОПР'у пры НКФ т. Заца па ...таньні аб перагляде ў апэляцыйным ...радку ў Вільні справы Беларускай Сял...ска-Работніцкай Грамады, надзвычай...агульны сход супрацоўнікаў НКФ Бсія...адзначае:

На працягу 2-х год пасьля разгр...100-тысячнай Бел. Сялянска-Работні...Грамады масавы белы тэрор на абш...Заходняе Беларусі супроць сацыяльн...і нацыянальнага вызваленчага руху ...цоўных ня спыніўся, а нішчэ больш уз...ніўся.

Масавы нацыянальна-вызваленчы ...ны...ых...ых працоўных ...

У Савеце Народных Камісараў.

На гэтым пасяджэньні разам з іншымі разглядаліся наступныя пытаньні

Санітарнае становішча БССР і дзейнасьць санітарных органаў.

СНК выслухаў даклад Народнага Камісара Аховы Здароўя тав. Барсукова аб санітарным становішчы БССР і аб дзейнасьці санітарных органаў.

Санітарнае становішча БССР пакуль што яшчэ цяжкае. У выніку вайны і масавага руху насельніцтва стварыліся цяжкія санітарныя ўмовы, якія ў значнай меры адбіліся на здароўі працоўных, на расаўсюджваньні цэлага шэрагу эпідэмій і сацыяльных хваробаў і далі значны рост захваранняў насельніцтва ў першыя гады савецкага будаўніцтва. І толькі ва ўмовах мірнага савецкага будаўніцтва мы пачынаем выходзіць з цяжкага санітарнага становішча, якое дасталося нам у спадчыну ад мінулага. Настойлівасьць у правядзеньні супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў мела вынікам паступовае зьніжэньне эпідэмічных захваранняў, аб чым сведчаць такія, напрыклад, як спынка...

...ня ...ня ...ня

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАЛАЖЭНЬНЕ ПРА РАЙЁННУЮ ВЭТЭРЫНАРЫЮ.

Агульнае палажэньне.

1. Вэтэрынарныя вучасткі існуюць для правядзеньня мерапрыёмстваў па барацьбе з заразьлівымі і пошасными хваробамі жывёлы, вэтэрынарна-санітарнага нагляду, а таксама для забясьпечаньня насельніцтва вэтэрынарна-лекавай і іншай вэтэрынарнай дапамогай (асьвета, зоотэхніка, гігіена).

2. Задачамі вэтэрынарнага вучастку зьяўляюцца:

а) вывучэньне вэтэрынарна-санітарнага становішча вучастку, правядзеньне вэтэрынарна-санітарных і прафілактычных мерапрыёмстваў і аховы насельніцтва ад заразьлівых і паразітарных хвароб, супольных людзям і жывёле;

б) барацьба з заразьлівымі хваробамі жывёлы;

в) лекавая дапамога хворай жывёле;

г) вэтэрынарная, культурна-асьветная праца;

д) удзел у зоотэхнічных мерапрыёмствах для разьвіцьця жывёлагадоўлі;

е) удзел у страхаваньні жывёлы ад падзяку, а таксама ў страхаваньні ўбойнай хатняй жывёлы;

ж) удзел у іншых мерапрыёмствах дзяржаўных і грамадзкіх арганізацый у галіне сельскае гаспадаркі.

3. Вэтэрынарны вучастак беспасрэдна падпарадкаван раённаму вэтэрынарнаму доктару.

4. Кожны вэтэрынарны вучастак павінен мець: амбулаторыю з цёплым манежам для прыёму хворай жывёлы, спэцыяльнае памяшканьне для стацыянарнай лекавай дапамогі, газавую камэру, кубыль, аптэку, памяшканьне для чаканьня насельніцтва, дыягностычны габінэт з належным абсталяваньнем для дыягностычных [illegible] і правядзеньня экспэртыз, [illegible]алтар для жывёлы, хворай [illegible] хваробамі, і кватэры для вэтэрынарнага персаналу.

5. Вэтэрынарная дапамога робіцца бясплатна.

Вучастковыя вэтэрынарныя дактары.

6. Вучастковыя вэтэрынарныя дактары назначаюцца на службу і звальняюцца з яе раённымі выканаўчымі камітэтамі па ўзгадненьні з акруговымі вямельнымі аддзеламі.

7. Вучастковы вэтэрынарны доктар зьяўляецца загадчыкам вучастку, загадвае лячэбніцаю і амбулаторыяю вучастку і ўдзельнічае ва ўсіх вэтэрынарных мерапрыёмствах мясцовых органаў.

Для папярэджаньня хвароб, супольных чалавеку і жывёле, вэтэрынарны доктар павінен узгадняць свае мерапрыёмствы з мясцовым метадычным персаналам.

8. Вучастковаму вэтэрынарному доктару беспасрэдна падпарадкаваны яго памочнікі (вэтэрынарныя фэльчары) і вэтэрынарныя санітары вучастку.

9. Вучастковы вэтэрынарны доктар наглядае за выкананьнем насельніцтвам і ўстановамі Вэтэрынарнага Статуту і іншых законаў і загадаў органаў улады ў вэтэрынарнай галіне. У выпадку парушэньня гэтых законаў і загадаў—складае адпаведны акт і накіроўвае яго належным органам улады для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці, паводле артыкулаў 108-114 Вэтэрынарнага Статуту БССР.

10. У галіне вэтэрынарна-санітарнай і прафілактычнай [illegible] вучастковы вэтэрынарны доктар на [illegible]лядае:

а) за жывёлаю, птушкамі і сырымі жывёлавымі прадуктамі, што транспартуюцца па грунтавых і водных шляхох і чыгунках на яго вучастку;

б) за мясамі апрацоўкі сырых жывёлавых прадуктаў (гарбарні, салатоні, кішочнае [illegible] і інш.), а таксама за мясамі загатовак мясных жывёлавых прадуктаў;

в) за конскімі заводамі, заводзкімі размножнікамі і злучнымі пунктамі;

г) за кірмашамі, рынкамі, выстаўкамі, вазлынымі дварамі і іншымі мясцамі стаяньня і часовага згуртаваньня жывёлы;

д) за разьбіцамі, жывёлапрыгонными дварамі, станцыямі агляду прывозных мясных прадуктаў, трактамі, прыбральным трупаў і жывёлавымі могільнікамі.

11. У галіне барацьбы з заразьлівымі хваробамі на вучастковага вэтэрынарнага доктара ўскладаецца:

а) своечасовае папярэджаньне і ліквідацыя заразьлівых хвароб жывёлы;

б) правядзеньне вагалоўных агляду жывёлы для высьвятленьня заразьлівых хвароб, правядзеньне прымчэнак усіх відаў і іншых мерапрыёмстваў;

в) пры атрыманьні зьвестак аб заразьлівых і пошасных хваробах на вучастку, вучастковы доктар павінен рабіць абсьледаньне і ўжываць усе захады для ліквідацыі хвароб;

г) пры немагчымасьці ліквідаваць эпізоотыю сваімі сіламі раённы альбо вучастковы доктар хадайнічае перад раённым выканаўчым камітэтам аб камандыраваньні падсобнага вэтэрынарнага персаналу.

При службовых выездах у месца захаваньня жывёлы раённыя выканаўчыя камітэты павінны бясплатна даваць вэтэрынарнаму персаналу транспартныя сродкі ці месца захаваньня жывёлы ня бліжэй аднаго кілёметру ад вэтэрынарнага пункту.

12. Вучастковы вэтэрынарны доктар павінен рабіць дапамогу хворай жывёле і птушкам, якія дастаўляюцца ў амбулаторыю альбо лячэбніцу ў часы і дні, устаноўленыя правіламі ўнутранага распарадку. У іншы час і ў дні адпачынку лекавая дапамога робіцца толькі ў пагражаючых жыцьцю жывёлы выпадках, паводле інструкцыі Народнага Камісарыяту Земляробства.

Вэтэрынарна-лекавая дапамога на месцы захаваньня жывёлы робіцца толькі ў тых выпадках, калі захварэўшая жывёла на стану свайго здароўя ня можа быць дастаўлена ў лячэбніцу.

Дробная жывёла, а таксама парсяты і жарабяты маладзей 6 месяцаў пры іх захварэньні для лекавай дапамогі павінны дастаўляцца ў лячэбніцу.

13. У часы амбулаторнага прыёму выезды да хворай жывёлы дапускаюцца толькі ў безадкладных выпадках, прычым вэтэрынарны доктар мае права камандываць для дапамогі хворай жывёлы свайго памочніка (вэтэрынарнага фэльчара).

14. Парадак абслугоўваньня дзяржаўных, кааперацыйных і грамадзкіх арганізацый і ўстаноў, што знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку, апроч калектыўных гаспадарак і камун, устанаўляецца раённымі выканаўчымі камітэтамі.

15. Пакладаньне жывёлы бяднейшых грамадзян, звольненых ад сельска-гаспадарчага падатку, робіцца бясплатна, а пакладаньне жывёлы іншых грамадзян—за плату, разьмер якой устанаўляецца раённымі выканаўчымі камітэтамі.

16. У галіне вэтэрынарнае культурна-асьветнае працы на вучастковага доктара ўскладаецца:

а) папулярызацыя вэтэрынарных ведаў сярод шырокіх мас насельніцтва, праз правядзеньне курсаў, гутарак, лекцый, распаўсюджваньне літаратуры і інш.;

б) прыцягненьне насельніцтва да самадзейнасьці, праз арганізацыю вэтэрынарна-санітарных панячыцельстваў і кіраваньне імі, паводле інструкцый органаў Народнага Камісарыяту Земляробства.

Уся вэтэрынарная культурна-асьветная праца вэтэрынарным вучастковым доктарам праводзіцца разам з мясцовымі дзяржаўнымі і грамадзкімі арганізацыямі.

17. У галіне зоогігіенічных мерапрыёмстваў вучастковы вэтэрынарны доктар удзельнічае ў якасьці члена зоотэхнічных камісій і эксперта на выстаўках, пры прэміраваньні жывёлы, пры адобры племянных і ўхваленых выторвэрыках, удзельнічае ў падлікуваньнямі органамі коняй. [illegible] рада [illegible]

18. Вучастковы вэтэрынарны доктар робіць вэтэрынарна-санітарны агляд сельска-гаспадарчай жывёлы, што страхуецца ад падзяку і ад бракоўкі забойнай жывёлы на рэзьніцах.

19. У выпадку захварэньня альбо адсутнасьці вучастковага доктара, загадваньне вучасткам ускладаецца раённым вэтэрынарным доктарам на доктара суседняга вучастку альбо на вэтэрынарнага фэльчара.

Раённы вэтэрынарны доктар.

20. Раённы вэтэрынарны доктар яднае працу вучастковых доктараў аднаводнага раёну і зьяўляецца адказным за вэтэрынарна-санітарны стан раёну. Яму падпарадкаваны вэтэрынарныя дактары і фэльчары гэтага раёну.

21. Раённы вэтэрынарны доктар зьяўляецца кансультантам аднаводнага раённага выканаўчага камітэту па ўсіх вэтэрынарных пытаньнях, а таксама кіруе складаньнем плянаў і каштарысаў па вэтэрынарыі ў раёне.

22. Раённы вэтэрынарны доктар прызначаецца на пасаду і звальняецца з яе раённым выканаўчым камітэтам па ўзгадненьні з акруговым вямельным аддзелам.

23. Раённы вэтэрынарны доктар загадвае адным з вучасткаў раёну.

24. Раённы вэтэрынарны доктар прызначае на пасаду і звальняе з пасады вэтэрынарных фэльчароў і санітараў раёну.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

23 лютага 1929 году,
г. Менск.

Нявыкананы замах?

«Слово» (№ 45) паведамляе, што нейкі дзён таму назад паліцэйскі патруль затрымаў у Слоніме нейкага Леона Каміньскага, які пры наближэньні да яго паліцэйскіх кінуўся на іх з сякерай, якую ў яго адабралі. У паліцэйскім вучастку быццам высьвятлілася, што каміньскі меў намер зрабіць замах з ручнымі гранатамі на аднаго з служачых ведчага аддзелу, адкуль гэтага ня выйшаў, бо заўсёды ў сьледчым аддзеле знаходзіліся пастаронныя людзі.

Вынікі выбараў да навагрудзкага магістрату.

24 лютага адбыліся выбары да навагрудзкага магістрату, рэзультаты іх наступныя: польска-беларуская група (аляксюкоўцы) атрымала 7 мандатаў, хрысьціянска-магамэтанская 12, яўрэйская—12, мацчанская—4 і магамэтанская—1.

Вынікі выбараў да баранавіцкага магістрату.

На выбарах у баранавіцкі магістрат польская група атрымала 7 мандатаў, яўрэйская—11, ПКС—2, расейцы—2, [illegible]—1 і Поплей-Сыён—1.

Крызіс у віл. яўрэйскай радзе.

У сувязі з цяжкай фінансавай сітуацыяй віленскай яўрэйскай рады—выдзелы рады з старшынёю Крукам [illegible]аўся ў адстаўку.

Белыя рабыні.

«Слово» (№ 46) паведамляе, што 2 сакавіка выяжджае з Вільні ў Францыю эшэлон сельска гаспадарчых работніц, інтрантаваных у паветах Сьвянцянскім і [illegible]ладзьнскім.

Канфіскацыя „Вільнэр Тог“.

Віленская адміністрацыя канфіскавала яўрэйскую газету «Вільнэр Тог» 26 лютага за зьмяшчэньне артыкулу і заметак, забароненых арт. [illegible] КК.

„Беларускай духоўнай сэмінарыі“.

«Кур'ер Віл.» (№ 47) паведамляе, што бел. дух. сэмінарыі ў Вільні на пасаду [illegible]ктара яе назначэна б. кіраўнік беларускай гімназіі ў Вільні Ал. Міхалевіч. Гэтае назначэньне, піша «Кур. Віл.»,—ба прыняць высока адведным, бо Міхалевіч бязумоўна здолее зьмяніць [illegible]ную атмасфэру праваслаўнай сэмінарыі»...

Што пад усім гэтым разумее «Кур'ер Віл.»,—трудна сказаць.

Бюджэт Вільні.

«Дз. Віл.» (№ 48) паведамляе, што [illegible] апрацован бюджэт г. Вільні, які [illegible] пясьца 12 млн. зл. У параўнаньні [illegible]юджэтам мінулага году ён больш [illegible] 10 процантаў.

Выдадзены кнігі.

У першых днях лютага г. г. у Коўні ў працягу нескальких дзён была адкрыта прэсавая выстаўка. Свае экспанаты выставілі ўсе выдавецтвы таварыствы і рэдакцыі. Аказалася, што ім новых кніжак асабліва ўзрос у 1928 годзе.

Ад 1914 г. да 1917 выдана 741 кніжка. У 1918 г. выдана 212 кн., у 1919—252, у 1920—423, у 1921—386, у 1922—347, у 1923—285, у 1924—243 і ў 1926—755 кніжак.

Прэса ў 1928 г.

У працягу мінулага году на тэрыторыі Літвы выходзіла агулам 156 перыядычных выданьняў, а менавіта: штодзённікаў—17, тыдзённікаў—37, месячнікаў—49 і г. д. з іх 124 было літоўскіх, 13—нямецкіх, 7—польскіх, 6—расейскіх, 2—яўрэйскіх, 3—літоўска-нямецкіх і 1—у гэбрайскай мове.

АДУСЮЛЬ.

Арышты ў фінскай армії

«Слово» (№ 39) паведамляе, што на Тэрыоки на савецка-фінляндзкім пагранічным арыштавана некальки фінляндзкіх вайсковых і цывільных асоб па абвінавачаньні ў камуністычнай прапагандзе.

Замах на польскага консула ў Парыжы.

«Наш Пшоглёнд» (№ 52) паведамляе, што 20 лютага зроблен быў замах на генэральнага консула ў Парыжы, Карала Пазнанскага. Нейная асоба, праўдападобна наймі, кінулася з нажом на консула, які шчасьліва ня быў паранены. Нападаўшага арыштавалі.

Абмен вязьнямі з Польшчай.

«Кур'ер Віл». (№ 36) паведамляе, што ў бліжэйшым часе чакаецца ў Маскве падпісаньне польска-савецкай умовы ў справе абмену значнай колькасьці польскіх вязьняў.

Польска-латвійскае паразуменьне.

12 лютага ў Рызе падпісаны Польшчай і Латвіяй тры чыгуначныя ўмовы, патрэбныя дзеля ўвядзеньня ў жыцьцё беспасрэдняй польска-латвійскай чыгуначнай камунікацыі.

Новы польскі пасол у Латвіі.

«Слово» (№ 36) паведамляе, што прэзыдэнт Латвіі выказаў згоду на назначэньне новага польскага пасла ў Рызе п. Міраслава Арцішэўскага.

Беспрацоўе ў Англіі ў 1928 годзе.

Процант беспрацоўных у Англіі раўняўся ў працягу 1928 г. 12,2 проц. усіх рабочых. У паасобных округах сітуацыя прадстаўляецца так: у Лёндане—5,6 проц., паўднёвы ўсход—5,5 пр., паўднёвы захад 8,2 пр., Мідляндзкі—10 пр., паўночны ўсход—15,2 пр., паўночны захад—12,4 пр., Шкоцыя—11,7 пр., Валія—22,8 пр. і паўночная Ірляндыя—17,1 пр.

Беспрацоўе ў Нямеччыне.

Афіцыяльны бюлетэнь Берлінскай статыстычнай управы паведамляе, што ў канторы студзеня г. г. зарэгістравана ў Нямеччыне 2222000 беспрацоўных.

ВЫБІРАЕМ У ГАРСАВЕТ ЛЕПШЫХ.

Трэба арганізаваць парк культуры і адпачынку

(На сходзе культасьветных працаўнікоў г. Менску).

Працаўнікі Беларускай Акадэміі Навук, НД інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі, Наркамасьветы, Беларускага Дзяржаўнага музэю і цэнтраархіву зьявіліся на перавыбарчы сход у колькасьці 72 проц. Частка працаўнікоў знаходзіцца ў камандыроўках і ня ўсе маглі зьявіцца на перавыбары. Трэба адзначыць прыкрае зьявішча; гарсавет дрэнна зрабіў, не пазнаёміўшы наперад праз друк ці праз мясцовы са зьместам наказу, а стаіць на марозе і чытаць наказы на рагох вуліц—ня ўсе могуць. Вельмі часта толькі на сходзе працаўнікі знаёмяцца з наказам. І вусім слушна, што гэта адымае шмат часу на разбор наказу.

Вось гэта незнаёмства са зьместам наказу да перавыбараў адчувалася і на сходзе навуковых працаўнікоў.

Пры абгаварэньні наказу сход зьвярнуў асаблівую ўвагу на пашырэньне сеткі культ-асьветных устаноў на акраінах. Гарсавет павінен пабудаваць сямігодку на Нярэсьне, дзе есьць шмат беднаты, бо дзецям з гэтай акраіны вельмі далёка хадзіць у школы. Далей трэба наблізіць да прадпрыёмстваў сетку культ-асьветных устаноў, каб яны маглі ахапіць усе культурныя запатрабаваньні рабочых мас.

Няма чаго сароміцца і трэба сказаць праўду, што на цэнтральных вуліцах г. Менску няма грамадзкіх уборных. Гэта пытаньне атрымала актыўнае падтрыманьне, і новаму складу гарсавету прапануецца пакланаціцца аб гэтым. Таксама пастаноўлена, каб гарсавет пабудаваў у мясцох астаноўкі аўтабусаў і будучага трамваю крытыя павэтачкі, каб у выпадку дажджу можна было схавацца пад іх.

Сталіца БССР—Менск далёка яшчэ ад належнага дабрабыту. Асабліва дрэнна адчувае сабе працаўнік у летнюю сьпёку. Гарсавет павінен ужыць меры, каб арганізаваць парк культуры і адпачынку. Апроч таго, у Менску трэба арганізаваць гарадзкі музэй, які адбіваў-бы старажытны Менск і сучасны быт працоўных.

Сучасная санітарна-бытавая ўмовы гораду яшчэ далёка не здавальняючыя. Мала лазьняў, а тыя, што ёсьць, цесныя. Трэба пашырыць існуючыя, пабудаваць новыя лазьні і паленшыць іх санітарны стан. Каб вырашыць жыльлёвы крызіс, гарсавет павінен у першую чаргу даваць кватэры рабочым, якія жывуць у дрэнных у санітарных адносінах кватэрах.

Так, пункт за пунктам разабралі ўвесь наказ і дапоўнілі яго дадаткамі.

Дэпутатамі гарсавету абраны: тав. М. Кудзелька рэдактар «Сав. Беларусі» (член КП(б)Б), т. Ошараў, Інспэктар яўрэйскай культуры НКА (член КП(б)Б), кандыдатам—т. Жураўскі—працаўнік ЦБ краязнаўства (беспартыйны).

ТАВ. КРУПСКАЯ—ГАНАРОВЫ ЧЛЕН МЕНСКАГА ГАРСАВЕТУ.

Рабочыя менскай шчацінная фабрыкі імя Крупскай 28-га лютага на перавыбарчым сходзе абралі Н. К. Крупскую ганаровым членам Менскага Гарсавету.

ХРОНІКА.

У прэзыдыуме ЦСПСБ.

Ажыўць працу камісіі па рабочаму снабжэньню.

На пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ была абгаворана справаздача камісіі па рабочаму снабжэньню пры Наркамгандлі БССР. Прэзыдыум адзначыў слабую працу камісіі: ня было плянавасьці ў працы, шэраг прынцыповых пытаньняў на рабочаму снабжэньню вырашаўся бяз удзелу камісіі, шэраг пытаньняў разглядаліся ў камісіі бяз удзелу прадстаўнікоў прафсаюзаў.

У сваёй пастанове прэзыдыум ЦСПСБ зварачае ўвагу Наркамгандлю на неабходнасьць прыняць рашучыя крокі да ажыўленьня працы камісіі па рабочаму снабжэньню і правільна паставіць яе працу. Побач з гэтым прызнана неабходным, каб рашэньні камісіі да канчатковага іх правядзеньня ў жыцьцё паперодня ўзгадняць з прэзыдыумам ЦСПСБ.

Перавыбары фабзавмясцкомаў.

У сувязі са сканчэньнем тэрміну паўнамоцтва асобных фабзавмясцкомаў, прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў правесьці перавыбары апошніх у верасьні з 15 сакавіка да 15 чэрвеня.

Арганізацыям даручана канкретна распрацаваць гэта пытаньне і ўнесьці яго на чарговы пленум ЦСПСБ. ЦК саюзаў і акрпрафбюро запрапанавана распачаць падрыхтоўчую працу да правядзеньня перавыбараў фабзавмясцкомаў.

Аб удзеле ў пабудове радыёстанцыі імя Томскага.

Усесаюзны Цэнтральны Савет прафсаюзаў маркуе пабудаваць магутную радыёстанцыю імя т. Томскага. Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў прыняць удзел у пабудове гэтае радыё-станцыі шляхам набыцьця аднаго пая ў 5000 руб.

Гэта пытаньне канчаткова будзе вырашана на бліжэйшым пленуме ЦСПСБ.

Жывое кіраўніцтва месцамі.

Для правядзеньня ў жыцьцё пастаноў VIII зьезду прафсаюзаў і XII зьезду КП(б)Б аб сыстэматычнай пасылцы кіруючых працаўнікоў у мясцовыя прафарганізацыі на 1-2 месяцы, прэзыдыум ЦСПСБ запрапанаваў ЦП саюзаў металістаў, друкароў, вагарнікаў хімікаў і суднаў накіраваць у першай палове сакавіка на месцы сваіх працаўнікоў. Побач з гэтым пастаноўлена накіраваць аднаго кіруючага працаўніка ЦСПСБ у адну з округ на 1½ месяцы. Дадзены таксама апведная ўказаньні акруговым прафбюро аб пасылцы акруговых прафпрацаўнікоў у мясцовыя прафарганізацыі округі.

Прымацаваньне адказных прафпрацаўнікоў да прадпрыёмстваў.

Дзеля ўзмацненьня жывой сувязі і практычнай дапамогі ў працы мясцовых прафарганізацый, прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў прымацаваць шэраг адказных працаўнікоў ЦСПСБ і ЦП саюзаў да прадпрыёмстваў г. Менску. Прымацаваныя працаўнікі, апрача штодзённых наведваньняў прадпрыёмства, павінны на апошніх праводзіць 1 дзень у тыдзень. Вырашана ўвесьці ў практыку рэгулярнае скліканьне пры ЦСПСБ нарад прымацаваных для абмену вопытам і думкамі аб працы на прадпрыёмстве.

Да 5-годзьдзя Моперу ў БССР.

Да дню 5-годзьдзя Моперу ЦК Моперу БССР выдае адпаведную газэту «Шлях Моперу» і брашуру „5 год Моперу ў БССР“. У гэтых выданьнях будуць надведзены вынікі пацёгкадовай працы Моперу на Беларусі.

Сродкі ад гэтых выданьняў пойдуць на ўзмацненьне фонду Моперу.

Выпуск курсаў кааперацыйнага актыву.

Пры Беларускасаюзе працуюць усебеларускія курсы жанчын кааперацыйнага актыву. Курсы ставяць мэтай падрыхтаваць жанчын для практычнай і кіруючай працы ў кааперацыі. 5 сакавіка адбудзецца ўрачысты выпуск курсантак; будзе выпушчана 32 жанчыны, якія накіроўваюцца для працы ў вясковай і рабочай кааперацыі.

Да адказнасьці за злоўжываньні застрахаваных.

Па вестках Галоўсаспстраху, мясцовыя страхкагты перадаюць шэраг спраў у нарсуд для прыцягненьня да адказнасьці застрахаваных за злоўжываньне сваімі правамі. Так, выкрыта атрымоўваньне дапамогі з страхкас абманным чынам; ёсьць выпадкі, што пэнсію атрымоўваюць дамаўладальнікі, якія бяруць аренду за кватэры да 120 руб. у месяц.

Абсьледваньне санітарнага становішча Менску.

Менскі гарсавет прымацаваў 20 дэлегатак для ўдзелу ў абсьледваньні санітарнага становішча Менску. Дэлегаткі разам з санітарнымі дактарамі правядуць, у першую чаргу, абсьледваньне санітарнага становішча дамоў, двароў, крам, якія гандлююць харчовымі прадуктамі, і цырульні.

Новая электрастанцыя.

У бліжэйшы час будзе пушчана ў ход новая электрычная станцыя магутнасьцю ў 300 кілёват гадзін.

Мяркуецца частку прадпрыёмстваў перавесьці на ток.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК на 2 сакавіка 1926 г.

	Куп.	Прад.
1-я 6 проц. залатая пазыка	4—79	4—81.
2-я 6 проц. залатая пазыка	5—05	5—08.
Бяспроц. пазыка	26 г. 121—50	—123—50.
10-проц. выйгрышная пазыка	25—17	—25—27.
1-я індустрыяльная 6 проц.	25—63,5	—25—73,5.
3-я Сялянская 1927 г.	5—02,5	—5—04,5.
12-проц. рэнтн. 1927 г.	103—03	—103—08.
2-я пазыка індустрыяльная. проц.	26—08	—26—18.
2-я індустрыяльная бяспроц.	25—70	—25—80.
11-проц. унутран.	100—03	—100—08.

Што слухаць па радыё.

НЯДЗЕЛЯ, 3-га САКАВІКА.

10-00—10-55 Сялянская радыё-газэта.
11-00—12-00 Сялянскі канцэрт.
12-00—12-25 Сьпявайце разам з намі.
12-25—13-00 Канцэрт грамафоннай музыкі.
13-00—14-00 Лекцыя рабоча-сялянскага радыёўніверсытэту падрыхтоўчага курсу па матэматыцы.
17-00—17-55 Чае піянэра і вучня.
18-00—18-30 Камсамольская газэта „Чырвоная Зьмена“ па радыё.
18-30—19-10 Радыёаматар з адказамі на тэхнічныя запытаньні па радыё.
19-15—20-35 Музычна-літаратурны журнал.
20-45—23-00 Канцэрт.

ПАНЯДЗЕЛАК, 4-га САКАВІКА.

18-00—18-25 Гутарка ад МОПР'у.
18-25—19-20 Лекцыя РСРУ падрыхтоўчага курсу па матэматыцы.
19-20 — Перадача праграмы.
19-25—20-10 Беларуская рэвю-газэта.
20-10—20-35 Музычны адпачынак.
20-35—21-00 Гутарка старшыні ЦП саюзу хімікаў таў. Яндульскі (асабіста «Ход выканаці абгаворы вытворчых нарад па саюзу»)
21-00—23-00 Канцэрт.
23-00—23-20 Абгляд заўтрашняй прэсы.

АД ЦКК КП(б)Б.

У панядзелак, 11 сакавіка, а 6 з палов. гадз. увечары адбудзецца пасяджэньне партгрупы ЦКК КП(б)Б (Менск, Савецкая, 55, 3-ці паверх, пакой № 18), дзе будуць разглядацца справы наступных таварышоў:

1) Прапаленка Аўхіма Міклаевага—Аршанскай арганізацыі, 2) Шеляга, Ігната Фаміча—Заслаўскага раёну, 3) Вашчыла, Уладзімера Ігнатавіча—Менскай арганізацыі, 4) Клюшкіна Аляксандра Панфірава—Менскай арганізацыі, 4) Матусевіч Сафіі Яўсабаўны—Менскай арганізацыі, 6) Грынкевіча Паўла Тодаравіча—Заслаўскага раёну, 7) Пісарчыка Івана Васільевіча—Менскай арганізацыі, 8) Глебко Насты Якубавай—Менскай арганізацыі, 9) Бягуна Рыгора [illegible]—Менскай арганізацыі, 10) Халявы Веры Міхайлаўны—Менскай арганізацыі, 11) Шлапак Марыі Аляксееўны—Менскай арганізацыі, 12) Захаровіча Паўла Міклаевага—Менскай арганізацыі.

Паказаныя вышэй таварышы павінны зьявіцца ў вызначаны час. Праезд за свой кошт.

Сакратар ПК ЦКК КП(б)Б ЛЯУКОЎ.

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“ РАСЬСЛЕДВАЛА

ДРЭННЫЯ ПРАЦАЎНІКІ ЗЬНЯТЫ.

У допісе «Трэба горш, ды некуды», пасланым на рассьледваньне, паведамлялася, што Падгайцэўскі сельсавет падта дрэнна працуе—не праводзіць патрэбных кампаній, таксама заявы і скаргі сялян ляжаць бяз вынікаў. На допіс Шклоўскі РВК паведамляе: факты пацьвердзіліся і пры перавыбарах старшыня Юрчэнка і сакратар Лукашоў, як не апраўдаўшыя сябе, у склад сельсавету не абраны.

ГРОШЫ БУДУЦЬ СПАГНАНЫ.

У допісе «Растратчыкі на волі» паведамлялася, што ў Рудзенскім спажывецкім т-ве было шмат растрат, прычым ня прынята ніякіх мер да спагненьня грошай з растратчыкаў.

Пам. менскага акр. пракурора на допіс паведамляе, што выканаўчы ліст на спагнаньне грошай у суме 1833 рублёў з растратчыкаў Кудзенка, Шпілеўскага, Шасталава і Мінета знаходзіцца у судыканаўцы 6 вуч. Зараз спагнана толькі 182 рублі. Акрпракуратурай заарганізавана праўленьню т-ва перадаць судыканаўцы другі ліст, які ёсьць у т-ва на іншых растратчыкаў.

КАЛЕНДАРЫ НА БЕЛМОВЕ РАСПРАДАНЫ.

У допісе «Мы прадаем календары толькі расейскія» паведамлялася, што ў Рагачоўскім ЦРК ёсьць календары толькі расейскія і гэта не сазгодзіцца з [illegible] Беларусізацыі. Гэткае-ж вывішча ў [illegible]скім спажывецкім таварыстве, якое (па думцы аўтара) абслугоўваецца Рагачоўскім ЦРК.

На гэты допіс Рагачоўскі Райкампарт паведамляе, што беларускія календары ў ЦРК былі, але ўсе распраданы і зараз засталіся адны толькі расейскія. Гадзіхавіцкае спаж. т-ва абслугоўваецца райсаюзам, і ў ім таксама былі календары на беларускай мове, якія зараз таксама распраданы.

ФАКТ НЕ ПАЦЬВЕРДЗІЎСЯ.

У № 288 за 15-XII 28 г. быў вымешчан фэльетон „Нэрвовыя прафэсары“, у якім паведамлялася, што прафэсар Сох.-Гас. Акадэміі Люнгергаузэн атрымаў адносіну ад Горацкага гарсавету, сябрам якога ён выўляецца, з прапановаю зрабіць даклад аб сваёй працы, ад якой ён ухіляўся.

На гэты допіс ЦП саюзу працасьветы паведамляе, што факты, азначаныя ў допісе, не адпавядаюць сапраўднасьці.

НЕДАХОПЫ ВЫКРЫТЫ.

У допісе «Выкрыем недахопы ў землякарыстаньні» паведамлялася аб непарадках в землякарыстаньнем у Лагойскім раёне, факты, азначаныя у допісе, пасьля рассьледаваньня, пацьвердзіліся і прыняты захады да іх выпраўленьня.

ПАРУШЭНЬНЕ ПРАЦОЎНЫХ ЗАКОНАЎ.

У допісе «Гуровіч зьдзекуецца» паведамлялася, што пры прыняцьці новых працаўнікоў у Белдзяржгандлі главбух Гуровіч рабіў ім экзамен, прычым парушаліся існуючыя працоўныя законы. Факты, адзначаныя ў допісе, пацьвердзіліся; РСІ запрапанавала гэтым зьвяшчы ў далейшым выпрацьвіць.

НЕНАРМАЛЬНАСЬЦІ БУДУЦЬ ЗЬНІШЧАНЫ.

У допісе, вымешчаным у № 287 за 14-XII 28 г. «Шчыры гаспадар» паведамляецца, што ў Міхалкаўскім КСУ ёсьць сад, урэджай якога скарыстаны старшынёю Гарэлікам для сябе.

Рассьледваньнем выяўлена наступнае: за ўраджай саду атрымана 254 р. 40 к., якія паступілі ў фонд КСУ. Як ненармальнасьць, быў кепскі догляд саду, адсутнасьць кантролю і надбайнае адносіны. Старшыня Гарэлік, як бядняк і добры працаўнік, пакінут на пасе і яму даданы адпаведныя ўказаньні аб выпраўленьні недахопаў.

АБВІНАВАЧВАНЬНЕ СМАЛЯ НЕ ПАЦЬВЕРДЗІЛАСЯ.

У заметцы «Кватэра каштуе 4000 руб.» вымешчанай у № 287 нашай газэты за 1928 г. пісалася, што сакратар Полацкай АКК РСІ т. Смаль выкарыстаў сваё службовае становішча і зрабіў уплыў на праўленьне жаку, якое патраціла на рамонт яго кватэры 4000 руб. У заметцы таксама пісалася наогул аб безгаспадарчасьці ў рамонце памянёнага жаку.

Па гэтай справе ЦКК-РСІ паведамляе, што, згодна рассьледваньня Полацкай АКК, абвінавачваньне т. Смаля ў скарыстаньні свайго становішча ў справе рамонту кватэры зьяўляецца неабгрунтаваным. Адносна безгаспадарчасьці ў Жаку наогул справа перададзена на рассьледваньне.

Адказы дапішчыкам.

Аўтару допісу «Як прайшлі перавыбары Чэбатовіцкага сельсавету». Факты рассьледаваньнем Уваравіцкага райкампарту не ўстаноўлены.

Селькору. Факты, пры ведзеныя ў допісе „Ці ёсьць у пяве галава“ рассьледваньнем Халопяніцкага РВК не пацьвердзілі ся.

Суседу, На ваш допіс аб мыйне Крым. вышук паведамляе, што факты не пацьвердзіліся.

Селькору Н. А. „Як адзякаваў каморнік Андронаўскаму цану“—Аршанскай РСІ.

Макаеўскаму Хто «дапомога земляўладкаваць».—У Ляпінскі РВК.

Вучням Сенькаўскай школы і бацькам вучняў.—Аршаншчына. Вашы рэзалюцыі-пратесты супроць судовага працэсу над настаўніцай Л. Гаўрылоўч пераслані ў Аршанскую акруговую пракуратуру.

В. А. Ваш допіс „Аб партызанах“ быў накіраваны у Аргадзел ЦВК. Аргадзел згодзен з вашым погляданм наконт прыцягненьня грамадзкасьці пры выяўленьні партызанаў, каб лічыць залічэньне гэтакіх неадпавядаючых людзей. Але разам з гэтым аргадзел ня згодзен з вамі на штатныя стварэньня асобных арганізацый, як адсутнасьцю мэтавай устаноўкі.

Чытэндаху М. Факты, прыведзеныя ў вашым допісе—„У каапэрацыю пасуць а сяляне не атрымліваюць“, рассьледваньнем Талочынскай раймілыцыі не ўстаноўлены.

Анучыну Б. «Больш увагі пры рэгістрацыі аб'яднаньняў» — Полацкаму акрсавету.

Багуну.—Менск. Рэзалюцыю пераслані ў Мен. гар. інспэктуру пар. асьветы.

Апавяшчэньні.

У НЯДЗЕЛЮ, 3-га САКАВІКА А 6-й ГАДЗІНЕ Ў АЎДЫТОРЫІ № 35 (ЗЕМЛЯРОБСКІ ЗАВУЛАК) АДБУДЗЕЦЦА ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЮРЫДЫЧНАЙ СЭКЦЫІ НАВУКОВАГА ТАВАРЫСТВА ПРЫ БДУ.

НА ПАВЕСТКЦЫ ДНЮ:

1. ДАКЛАД ТАВ. АКІМАВА НА ТЭМУ: «АДКАЗНАСЬЦЬ ТАВАРНЫХ СКЛАДАЎ ЗА ТАВАР, ШТО БЯРЭЦЦА ІМІ ДЛЯ ЗАХАВАНЬНЯ».

2. ДАКЛАД ТАВ. ШАПАВАЛАВА НА ТЭМУ: «ДА ПЫТАНЬНЯ АБ РАЗУМЕНЬНІ НАЦЫІ».

У нядзелю, 3 сакавіка, а 6 гадз. увеч. ў памяшк. Пэдфаку—ауд. № 35—адбудзецца пасяджэньне літаратурнае сэкцыі Нов. Т-ва пры БДУ. Даклады: А. Н. Вазьнясенскі—«А. С. Грыбаедаў у рам. Тынянава «Сьмерць Вазір Мухтара». В. П. Тэпін—Грыбаедаў на масноўскай сцэне.

АКТАВАЯ ЗАЛЯ БДУ.

(Земляробскі заў. № 4).

Субота, 2-га сакавіка 1929 г. РОУНА А 4 ГАДЗІНЕ дню агульны сход усіх працаўнікоў БДУ па перавыбарах дэлегатаў у гарадзкі савет.

У нядзелю, 3-III, у 7 гадз. дня ў актавай залі Пэдфаку БДУ (Земляробскі заў.) на курсах краязнаўства будуць прачытаны лекцыі:

1) Акадэмік Пічэта: «Вывучэньне гісторыі БССР за апошнія 10 год». 2) М. Шчака